Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 КРАСАВІКА 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 64 (26177)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

**Прамая лінія**

## ЯК ПАПЯРЭДЗІЦЬ АСТЭАПАРОЗ І ЯК З ІМ ЗМАГАЦЦА?

Якія метады прафілактыкі і лячэння хваробы ёсць сёння? Гэтыя і іншыя пытанні вы можаце задаць падчас «прамой лініі» **загадчыцы кабінета астэадэнсітаметрыі Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Наталлі Аляксееўне ВАСІЛЬЕВАЙ.** ***«Прамая лінія» адбудзецца 11 красавіка ў пятніцу з 15.00 да 16.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).***

## «Абараняючы граніцы сваёй краіны, беларуская армія ахоўвае і заходнія рубяжы Саюзнай дзяржавы»

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, зацвярджаючы праект на правядзенне комплекснага аператыўнага вучэння «Восень-2008».**

«Мы не бразгаем зброяй, хачу гэта падкрэсліць. Але, на жаль, сёння мы не можам адзначыць, што вакол Беларусі ўсё спакойна і няма ніякіх праблем, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта відаць па апошніх падзеях. Блок НАТА замахнуўся нават на былыя савецкія рэспублікі. Думаю, што прыём Украіны і Грузіі ў НАТА — гэта пытанне часу». «Пры гэтым ніхто не звяртае ніякай увагі на пазіцыю Расіі, Беларусі, іншых краін постсавецкай прасторы», — дадаў Прэзідэнт. На заходніх рубяжах Саюзнай дзяржавы беларуская армія з'яўляецца асноўнай стрымальнай сілай. «Дагавор з Расіяй — справа святая. Мы павінны яго няўхільна выконваць, гэтак жа, як выконвае яго са свайго боку Расія, забяспечваючы нашай краіне шчыт, у тым ліку ядзерны», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Гаворачы аб маючым адбыцца вучэнні, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што яго кошт павінен быць мінімальны, але дастатковы для таго, каб правесці вучэнне якасна. Важны складальнік маючага адбыцца вучэння — падрыхтоўка асабовага складу запасу. У сувязі з гэтым плануецца прызваць амаль 3 тыс. чалавек з запасу. Будуць разгорнуты падраздзяленні тэрытарыяльнай абароны.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## «Байкатаванне Гульняў-2008 у Пекіне нанясе ўрон ідэям і прынцыпам алімпізму»

**У Рэспубліцы Беларусь з вялікім шкадаваннем успрыняты заклікі кіраўнікоў шэрагу дзяржаў аб байкоце XXIX летніх Алімпійскіх гульняў у Пекіне. Аб гэтым гаворыцца ў заяве Прэзідэнта Беларусі, Прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандра Лукашэнкі.**

«Лічу, што такія дзеянні з'яўляюцца імкненнем недальнабачных палітыкаў ператварыць сусветны алімпійскі рух у механізм грубага ўмяшання ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён таксама выказаў перакананасць, што няўдзел спартсменаў у Алімпійскіх гульнях у Пекіне нанясе непапраўны ўрон як самім спартсменам, так і ідэям і прынцыпам алімпізму.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што такія спробы палітызаваць спорт ужо мелі месца ў сусветнай гісторыі, аднак усе яны былі асуджаны на правал, таму што спыніць развіццё алімпійскага руху немагчыма. «Алімпійскія гульні з'яўляюцца агульным здабыткам чалавецтва, садзейнічаюць аб'яднанню народаў і захаванню міру на Зямлі. Расцэньваю дэструктыўныя заявы як спробу аказаць ціск на добразычлівы і працавіты кітайскі народ, які зрабіў усё для таго, каб Гульні ў Пекіне сталі знамянальнай падзеяй XXI стагоддзя», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка не сумняваецца, што кітайскім бокам будуць прыняты ўсе неабходныя меры па забеспячэнні бяспекі ўдзельнікаў і гасцей Алімпіяды. Ён таксама заклікаў спартсменаў усіх краін свету не паддавацца на правакацыю асобных палітыкаў, прыняць удзел у Гульнях і паказаць свае найвышэйшыя спартыўныя дасягненні. «Упэўнены, што Алімпіяда ў Пекіне яшчэ больш згуртуе спартсменаў усіх краін пад эгідай Міжнароднага алімпійскага камітэта і паслужыць захаванню каштоўнасцяў алімпізму для сусветнай супольнасці», — сказаў Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

### ЗША УВЯДЗЕННЕМ АДНАБАКОВЫХ САНКЦЫЙ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ ПАДАРВАЛІ ДАВЕР ДА СЯБЕ

**Аб гэтым заявіў прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў на брыфінгу.**

Паводле яго слоў, у сувязі з гэтым узнікае рытарычнае пытанне: ці можна давяраць Злучаным Штатам, у тым ліку ў такой значнай сферы, як нераспаўсюджванне ядзернай зброі. Каментуючы выказванні прадстаўнікоў дзяржаўнага дэпартамента ЗША адносна Беларусі, Андрэй Папоў падкрэсліў, «што яны змяшчаюць шэраг выказванняў, якія ў прынцыпе мала сумяшчальныя з цывілізаванай дыпламатычнай практыкай».

**БЕЛТА.**

### УЗАЕМАДЗЕЯННЕ БЕЛАРУСІ З ПА АБСЕ РАЗВІВАЕЦЦА ПА РОЗНЫХ НАПРАМКАХ

Супрацоўніцтва Беларусі з ПА АБСЕ ідзе няпроста, але ўсё ж рух ёсць. Узаемадзеянне развіваецца па розных напрамках. Аб гэтым заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Вадзім Папоў на сустрэчы ў Санкт-Пецярбургу са старшынёй Парламенцкай асамблеі АБСЕ Йоранам Ленмаркерам.

У сваю чаргу Йоран Ленмаркер сказаў, што «ПА АБСЕ цэніць існуючае супрацоўніцтва з парламентам Беларусі, усе дыскусіі, якія ўзнікаюць». Паводле яго слоў, «найлепшы шлях узаемадзеяння — весці адкрыты і шчыры дыялог». Кіраўнік ПА АБСЕ пазітыўна ставіцца да планаў па правядзенню сумеснага семінара і лічыць, што «тэма прамых замежных інвестыцый — вельмі важнае для Беларусі пытанне». «Рады таксама чуць, што Нацыянальны сход Беларусі падтрымлівае добрыя адносіны з Офісам АБСЕ ў Мінску», — падкрэсліў Йоран Ленмаркер.

**БЕЛТА.**

## Павялічаны гранічныя адпускныя цэны

**«Пастановай Міністэрства эканомікі № 72 з 1 красавіка 2008 года гранічыя адпускныя цэны на муку пшанічную для хлебапячэння павялічаны на 2,5—3 працэнты ў залежнасці ад гатункаў», — гаворыцца ў паведамленні міністэрства.**

Павелічэнне гранічных адпускных цэнаў на муку абумоўлена нізкай рэнтабельнасцю і стратнасцю вытворчасці мукі пшанічнай для хлебапячэння, звязанай з ростам кошту паліўна-энергетычных рэсурсаў і частковай закупкай імпартнай пшаніцы па сусветных цэнах, узровень якіх у 2007 годзе значна павысіўся, патлумачылі ў міністэрстве.

Апрача таго, пастановай міністэрства № 74 з 1 красавіка гэтага года павялічаны гранічныя адпускныя цэны на малако, кефір, смятану і тварог на 2 працэнты, ялавічыну і свініну першай і другой катэгорыі — на 1,5, свініну трэцяй катэгорыі — на 1, хлеб і хлебабулачныя вырабы — на 1 працэнт. Зроблена гэта для «кампенсацыі падаражання кошту малочнай і мясной сыравіны, звязанага з павышэннем у лютым гэтага года закупачных цэнаў на малако і жывёлу, а таксама падаражання мукі для хлебапячэння, з улікам стратнасці і нізкай рэнтабельнасці вытворчасці сацыяльна значнай малочнай прадукцыі і мяса, хлеба і хлебабулачнай прадукцыі», — патлумачылі ў прэс-службе міністэрства.

## Усяго толькі 50!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Іван Мікалаевіч і Вольга Дзмітрыеўна МАЦКЕВІЧЫ — вельмі паважаная пара ў Семежаўскім сельсавеце на Капыльшчыне. Іх шлюб доўжыцца паўстагоддзя. А гэта добры прыклад для тых, хто хоча стварыць моцны сямейны саюз. У дзень залатога вяселля семежаўскім «маладажонам» дзеці падарылі прыгожы абраз Божай Маці. «Усяго толькі 50», — усміхаюцца Іван Мікалаевіч і Вольга Дзмітрыеўна, былыя саўгасныя трактарыст і даярка.**

Абітурыент-2008

## «ПАДСТРАХАВАЎСЯ» З ТРОХРАЗОВЫМ ЗАПАСАМ

**У бліжэйшую суботу абітурыенты, якія мараць стаць журналістамі, дыпламатамі, мытнікамі ці юрыстамі будуць праходзіць у вышэйшых навучальных установах прафесійна-псіхалагічнае субяседаванне.**

Згодна з новымі Правіламі прыёму ў ВНУ пры паступленні на спецыяльнасці "дзяржаўнае кіраванне", «дзяржаўнае кіраванне і права», «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «міжнародныя адносіны», «міжнароднае права», «правазнаўства», «эканамічнае права», «журналістыка», «міжнародная журналістыка» і «мытная справа» ўсе абітурыенты павінны прайсці папярэдні прафадбор, які сёлета было вырашана праводзіць у выглядзе субяседавання. Рэгістрацыя абітурыентаў завяршылася 31 сакавіка. Такім чынам усе, хто своечасова не паклапаціўся аб рэгістрацыі для праходжання субяседавання, пазбавіліся ў гэтым годзе магчымасці паступаць на вышэйназваныя спецыяльнасці, у тым ліку і для атрымання другой ці паралельнай вышэйшай адукацыі. А такія, між іншым, ёсць...

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў, куды была перададзена інфармацыя з усіх пунктаў рэгістрацыі, нам паведамілі, што ўсяго для праходжання прафесійна-псіхалагічнага субяседавання зарэгістраваліся 14 132 фізічныя асобы. Але некаторыя абітурыенты рэгістраваліся для праходжання субяседавання па розных групах спецыяльнасцяў, што не забараняецца дзеючымі правіламі. Напрыклад, абітурыенты маглі зарэгістравацца аднačасова для паступлення на спецыяльнасці «правазнаўства» і «дзяржаўнае кіраванне». Таму агульная колькасць рэгістрацый склала 15 364.

Самая вялікая колькасць ахвотнікаў прайсці субяседаванне была зарэгістравана на групу спецыяльнасцяў «права» і «эканамічнае права» — 8420 чалавек. На групу спецыяльнасцяў «дзяржаўнае кіраванне», «дзяржаўнае кіраванне і права» і «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» зарэгістраваліся 3467 чалавек. Праходзіць субяседаванне на «міжнародныя адносіны» і міжнароднае права» будуць 1275 чалавек, на «журналістыку» і «міжнародную журналістыку» — 887 чалавек і на «мытную справу» — 1315 чалавек.

А далей пра самае цікавае. Усіх абітурыентаў папярэджвалі, што рэгістравацца на адну і тую ж спецыяльнасць у розных ВНУ катэгарычна забараняецца. Прайсці такую гутарку можна не больш чым адзін раз. Аднак гэта папярэджанне праігнаравалі 111 чалавек. Больш за тое, асабліва «прадпрымальны» малады чалавек умудрыўся за адзін дзень зарэгістравацца на «правазнаўства» адразу ў чатырох ВНУ. Напэўна, спадзяваўся на тое, што яго не змогуць вылічыць. На жаль, так «падстрахавацца» вырашыў не толькі ён адзін.

— Уся інфармацыя аб рэгістрацыі на папярэдні прафадбор была перададзена нам невыпадкова, — паведаміў у гутарцы з журналістам «Звязды» дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў. — У нашым інстытуце ёсць і тэхнічныя магчымасці, і багаты вопыт па пошуку вось такіх хітрыноў.

Пікантнасць гэтай сітуацыі заключаецца яшчэ і ў тым, што папярэдні прафадбор праводзіцца пры паступленні на тыя спецыяльнасці, дзе да прэтэндэнтаў прад'яўляюцца асаблівыя патрабаванні, у тым ліку і да маральных іх якасцяў.

Відаць па ўсім, пэўная частка маладых людзей, якія прэтэндуюць на паступленне на звышпрэстыжныя спецыяльнасці, гэтаму пункту не адпавядаюць. І гэта стала відавочным яшчэ да праходжання субяседавання...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### УРАД ЗАЦВЕРДЗІЎ ПЕРАЛІК МАЛЫХ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ, ДЗЕ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ІЛЬГОТЫ ДЛЯ БІЗНЭСУ

Савет Міністраў Беларусі зацвердзіў пералік населеных пунктаў, на якія распаўсюджваецца дзеянне дэкрэта ад 28 студзеня 2008 года № 1 «Аб стымуляванні вытворчасці і рэалізацыі тавараў (работ, паслуг)». Такое рашэнне прынята пастановай урада № 483, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна. У Брэсцкай вобласці ў пералік увайшлі населеныя пункты за выключэннем гарадоў Баранавічы, Брэст і Пінск. У Віцебскай вобласці — населеныя пункты, акрамя гарадоў Віцебск, Наваполацк, Орша і Полацк, у Гомельскай — акрамя Гомеля, Жлобіна, Мазыра, Рэчыцы і Светлагорска, у Гродзенскай — акрамя Гродна і Ліды, у Мінскай — акрамя Барысава, Жодзіна, Маладзечна, Слуцка і Салігорска, у Магілёўскай — за выключэннем Бабруйска і Магілёва.

## СЯЎБА ПРЫСПЕШВАЕ

**Сёлета на Брэстчыне хоць і зімы не было, а сапраўдная вясна прыпазнілася. Летась на першы дзень красавіка пасеялі ўжо каля трэці яравых збожжавых культур, а цяпер гэта лічба ўдвая меней. Але з надыходам цёплых дзён земляробы паўсюль выходзяць у поле і стараюцца хутчэй кінуць зерне ў зямлю, пакуль у ёй дастаткова вільгаці ад расталага снегу. Найбольш рупліва працуюць аграрыі Пінскага, Лунінецкага, Кобрынскага, Камянецкага, Пружанскага раёнаў.**

На Пружаншчыне пасеяна больш за 30 працэнтаў збажыны. Як сказала карэспандэнту «Звязды» намеснік старшыні Пружанскага райвыканкама Марыя Сцепанюк, летась у гэтую пару сяўбу завяршалі. Таму час прыспешвае. У раёне поўныя светлавыя дні працуюць 22 пасяўныя агрэгаты трактароў «Джон Дзір» і іншая тэхніка. Па разліках спецыялістаў, закончыць работу павінны да 12 красавіка, гэта найбольш аптымальныя тэрміны з пункту гледжання аграрэхнікі.



Фота Святланы КРАЎЧУК.

Высокую ацэнку атрымалі цяперашнія земляробы ад сталага і вопытнага селяніна Івана Яўстафавіча Сыча (на здымку). Ён сустракае ўжо 84-ю сваю вясну. Усё жыццё працаваў у калгасе. Сеяў і ўручную, і на конных касілках, добра памятае першыя трактары, якія прыйшлі на падмогу людзям. Вось і цяпер не ўсядзеў дзядуля Іван у хаце, калі ваколіца напоўнілася гулам тэхнікі, калі зямліца прымае новае зерне. Прыйшоў паглядзець на новы магутны агрэгат, які за адзін раз засявае шэсць метраў глебы. І гэтая аграмадная машына паслухмяная і ўмелая ў руках механізатара, вопытнага спецыяліста Уладзіміра Саскевіча.

З дапамогай свайго кіёчка змераў Іван Яўстафавіч глыбіню пасеву, патрымаў у руцэ камячок зямлі і зрабіў выснову, што ўраджай павінен быць добры. Калі прырода не падвядзе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Пружанскі раён.*

Выстаўка

## Белае і чорнае Юрыя Іванова

**Учора ў Міністэрстве інфармацыі адбылося ўрачыстае адкрыццё фотавыставы Юрыя Іванова «Паміж белым і чорным». У выставе прадстаўлены больш за сто работ майстра.**



Выставу адкрывалі першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Анатоль Рубінаў і міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч.

Асаблівасць творчасці Юрыя Іванова заключаецца ў тым, што ён не проста фіксуе падзею. «Важна ўлавіць момант жыцця, напоўнены эмоцыямі, змагчы яго перадаць. Майстру гэта ўдаецца», — сказаў Анатоль Рубінаў.

— Такая выстава, толькі ў больш пашыраным фармаце, прайшла восенню ў Нацыянальным мастацкім музеі, — расказвае Юрый Іваноў. — Цяпер жа я вырашыў — менавіта ў міністэрстве мае работы набудуць яшчэ большую незвычайную аўру, бо тут нараджаюцца газеты, кнігі і ...новыя ідэі. Спадзяюся, і для маіх будучых твораў. Мне вельмі хочацца, каб гэтыя работы дапамагалі людзям з усмешкай глядзець на навакольны свет.

Наведаць выставу можна будзе да канца красавіка.

**Марына БЕГУНКОВА.**
**Фота аўтара.**



ISSN 1990 - 763X

Конкурсы

## ПЕРАМАГЛА... НЕПАСРЭДНАСЦЬ!

**Пад эгідай Міжнароднага бюро Сусветнага паштовага Саюза (СПС) і ЮНЕСКА сёлета ў 37-ы раз праводзіцца міжнародны маладзёжны эпістальярны конкурс, у 12-ы раз удзел у ім прымае Беларусь. Гэта значыць, што разам з аднагодкамі з усіх куткоў свету і нашы хлопцы і дзяўчаты (да 15 гадоў) пісалі лісты сваім папярэднікам, наступнікам, сябрам і людзям дарослым, казачным героям... Пра што? Сёлета (тэму выбірае Міжнароднае бюро СПС) — пра тое, чаму свет мае патрэбу ў цярпімасці.**

Як і ў папярэднія гады, наш Беларускі эпісталярны конкурс праходзіў у некалькі этапаў — вызначаліся пераможцы на раённым узроўні, потым — на абласным. Днямі аўтарытэтнай камісіяй у складзе намесніка генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Ірыны Саксонавай, галоўнага інспектара Міністэрства адукацыі Раісы Сідарэнкі, прадстаўнікоў рэспубліканскіх СМІ падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу.

У ім на разгляд журы было прадстаўлена сем (па адной з кожнай вобласці і горада Мінска) зусім непадобных работ. Глыбінёй даследавання вызначаліся лісты-сачыненні дзевяцікласніц Маргарыты Бембель з Верхнядзвінскай школы № 2 і Кацярыны Панамаровай з Мар'інагорскай гімназіі, высокім палётам думак — праца іх равесніцы брастаўчанкі Надзеі Пашцепы, шчырасцю — Алены Ерашэвіч, дзесяцікласніцы Гродзенскай школы № 9, назіральнасцю — Яўгена Парасачкі, дзевяцікласніка сталічнай школы № 87, трывогай за іншыя краіны (дзе міру няма) і гонарам за сваю — Валерыі Няшытай, васьмікласніцы Гомельскай шматпрофільнай гімназіі № 14, дзіцячай непасрэднасцю — Рамана Шыхліна, сямікласніка Сялецкага вучэбна-педагагічнага комплексу «Дзіцячы садок-сярэдняя агульнаадукацыйная школа».

Іншымі словамі — вызначыць лепшы ліст, ліст, які будзе прадстаўляць нашу краіну на міжнародным узроўні, было досыць цяжка.

Перамагла — непасрэднасць. Паводле меркавання Рамана Шыхліна (паспрабуйце з ім не згадзіцца!), свет мае патрэбу ў цярпімасці таму, што гэта проста... выгадна, бо ў чалавека, які не рве нервы іншым і сабе, будуць і добрае здароўе, і надзейныя сябры, і дружная сям'я, і поспехі ў вучобе...

На другім месцы працы-лісты гамяльчанкі Валерыі Няшытай і мінчаніна Яўгена Парасачкі, на трэцім Алены Ерашэвіч, Маргарыты Бембель, Кацярыны Панамаровай і Надзеі Пашцепы.

Усе пераможцы будуць узнагароджаны спецыяльнымі паштовымі сувенірамі ад РУП «Белпошта» і грашовымі прэміямі. Заахвочаны будуць і іх настаўнікі рускай мовы. Аб тым, якое месца зойме работа нашага пераможцы на міжнародным узроўні, пакажа час. Пакуль вядома, што перамога нашым удзельнікам ужо ўсміхалася. І нават не раз.

**Валянціна ДОЎНАР.**

РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НЕСАПРАЎДНАЯ САЛЯРКА

Барацьбіты з эканамічнымі злачынствамі выявілі чарговую групу аферыстаў, якая гандлявала «фальшывым» дызпалівам. Паводле звестак УУС Мінаблвыканкама, пяцёра жыхароў сталіцы яшчэ 2 гады таму наладзілі пастаўкі дызпаліва слуцкай фірме «ВКТ-Ойл». Насамрэч, як высветлілася, махляры збывалі памянёнай камерцыйнай структуры пад выглядам саляркі пячное паліва. Усяго за паўгода прайдзісветы зарабілі на гэтай аферы 200 мільёнаў рублёў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### УРОК АД ЧЭШСКІХ ХАКЕІСТАЎ

Зборная Беларусі па хакеі пачала падрыхтоўку да чэмпіянату свету ў Канадзе і правяла першы таварыскі матч. Падначаленыя Курта Фрэйзера прайгралі нацыянальнай камандзе Чэхіі — 2:7 (1:4, 1:2, 0:1). Шайбы ў складзе нашай дружыны закінулі ігракі наваполацкага «Хіміка-СКА» Ігар Шведаў (на 19-й хвіліне) і Юрый Елісеенка (на 38-й). Матч прымаў чэшскі горад Тршэбіч.

### У РАСІІ — САМЫ БАГАТЫ ПАРЛАМЕНТ

Часопіс «Forbes» высветліў, што парламент Расіі — самы багаты ў свеце. У Дзярждуме і Савеце Федэрацыі засядаюць 12 мільярдэраў, агульнае багацце якіх ацэньваецца ў 41 млрд долараў. На першым месцы сярод самых багатых расійскіх дэпутатаў і сенатараў знаходзіцца Сулейман Керымаў, член Савета Федэрацыі ад Рэспублікі Дагестан, ён жа з'яўляецца ўладальнікам кампаніі «Нафта Масква». Па даных амерыканскага часопіса, яго багацце вылічваецца ў 17,5 млрд долараў. Усяго ў Расіі 87 мільярдэраў.

### ШТОГОД ПРЫКЛАДНА 100 КВАТЭР У БЕЛАРУСІ КУПЛЯЮЦЬ ІНШАЗЕМЦЫ,

паведаміў старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай Прасталупаў. Значная доля прыпадае на расіян. Пры гэтым замежных грамадзян цікавяць не толькі элітныя дамы і кватэры. Для другаснага рынку жылля характэрна тэндэнцыя зніжэння колькасці здзелак куплі-продажу. У першым квартале гэтага года іх колькасць зменшылася ў 2—3 разы да ўзроўню таго ж мінулагодняга перыяду.

**Наталля ВЯРБІЦКАЯ, БЕЛТА.**

**Паритетбанк**

**Уважаемые акционеры!**

**ОАО «Паритетбанк» сообщает, что с 20 мая 2008 г. будет производиться выплата дивидендов по итогам работы банка за 2007 год в размере:**

- по простым акциям — 0,11 руб. на акцию;
- по привилегированным — 500 руб. на акцию.

Список лиц, имеющих право на получение дивидендов, составлен в соответствии с реестром акционеров банка на 19 марта 2008 г. Физические лица могут получить дивиденды при наличии паспорта.

**Обращайтесь по следующим адресам:**

ОАО «Паритетбанк» (Головной банк): г. Минск, ул. Гамарника, 9/4, тел. (8-017) 288-38-29;
РКЦ № 1 г. Минск, пр-т Победителей, 21, тел. (8-017) 203-97-22;
ЦБУ № 1 в г. Витебске, ул. 2-я Продольная, 3, тел. (8-0212) 23-80-90;
ЦБУ № 3 в г. Минске, ул. Тимирязева, 125/9, тел. (8-017) 254-74-98;
ЦБУ № 4 в г. Минске, ул. Кижеватова, 7/2, тел. (8-017) 201-90-17;
ЦБУ № 5 в г. Минске, ул. Немига, 8, тел. (8-017) 227-63-42;
ЦБУ № 6 в г. Гродно, пл. Советская, 6, тел. (8-015) 274-56-64;
ЦБУ № 7 в г. Пинске, ул. Иркутско-Пинской дивизии, 36, тел. (8-0165) 32-35-59;
ЦБУ № 8 в г. Могилеве, ул. Тимирязевская, 44, тел. (8-0222) 28-72-53;
ЦБУ № 9 в г. Жлобине, ул. Урицкого, 86, тел. (8-02334) 2-89-04;
ЦБУ № 10 в г. Мозыре, ул. Ленинская, 6, тел. (8-02351) 2-27-76;
ЦБУ № 11 в г. Столине, пл. Комсомольская, 9, тел. (8-01655) 2-00-74;
ЦБУ № 12 в г. Бобруйске, ул. Пролетарская, 28, тел. (8-0225) 52-29-58;
ЦБУ № 14 в г. Гомеле, ул. Гагарина, 46, тел. (8-0232) 74-43-85;
ЦБУ № 15 в г. Бресте, пр-т Машерова, 35, тел. (8-0162) 20-56-44;
ЦБУ № 16 в г. Барановичи, ул. Брестская, 279, тел. (8-0163) 40-04-28.

**Телефон для справок: (8-017) 288-49-43.**

*ОАО «Паритетбанк», УНП 100233809,*
*Лиц. НБ РБ на осущ. банк. деят. № 5 от 27.10.2006 г.*

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» 30.04.2008 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенной в доход государства производственной базы 1991 года постройки со всеми коммуникациями, расположенной в д. Дубеи Солигорского района (вдоль трассы Минск—Микашевичи) на земельном участке пл. 7,8961 га, в составе: здание котельной, об. пл. 1297,2 кв.м; теплая стоянка, 686,5 кв.м; здание материально-технического склада, 483,3 кв.м; здание мастерской, 1794 кв.м; склад нефтепродуктов, 109 кв.м; стоянка на 24 сельхозмашины, 1275,7 кв.м; профилакторий для автомобилей, 1348,2 кв.м; контрольно-пропускной пункт, 48,1 кв.м; здание наружной мойки, 771,7 кв.м; административно-бытовой корпус, 1024,6 кв.м. и др. Начальная цена – 3 376 490 210 белорусских рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06 июня 2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30 апреля 2008 г.** в 15.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, актовый зал. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **29 апреля 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже здания склада (об. пл. 463,4 кв.м, железнодорожная ветка), расположенного: Пуховичский район, г.п. Руденск, ул. Железнодорожная, 3. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 198 240 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка – 0,0723 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.01.2008 г. Аукцион состоится **15 апреля 2008 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14 апреля 2008 г**. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Телефоны (8017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

**Торговое частное унитарное предприятие «Внешагроопт» Белкоопсоюза**

**ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС**

**НА ЗАКУПКУ тканей хлопчатобумажных, изюма, масла растительного, термопленки от 15 мк до 80 мк, шпагата.**

Для участия в конкурсе необходимо представить конкурсные документы по адресу: 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 62-211.

***Предложения принимаются в течение 7 дней с момента опубликования объявления.***

**Конт. тел. для получения информации (8 017) тел./факс: 291 82 33, 291 92 96.**

УНП 600028588

## Пісьмо праверыў карэспандэнт

# КАРЫСТАЕШСЯ — ПЛАЦІ!

**«Прашу дапамогі і абароны маёй сям'і. Я трапіў пад прыгнёт мясцовых чыноўнікаў. Ужо споўнілася тры гады, як дабіваюся справядлівасці. Давялі да таго, што мяне ліхаманіць і становіцца дрэнна, калі гляджу на твары вымагальнікаў. Таму звяртаюся ва ўсе сродкі масавай інфармацыі, бо мяне ўзвялі ў ранг даўжніка за паслугі і ворага, а я — добрасумленны плацельшчык. Уся дакументацыя маецца, і ў любы час яе прадстаўлю карэспандэнту».**

Такое вось кароценькае пісьмо атрымала наша рэдакцыя ад жыхара Гомеля з вуліцы Гарбатава — **Аляксандра Антонавіча АГЕЙЧЫКА.** Вось што ён расказаў.

Ён жыве са сваімі жонкай Марыяй Васільеўнай, сынам Уладзімірам і дачкой Святланай Несцеравай у двухпакаёвай кватэры, уласнікам якой з'яўляецца апошняя. У іх сям'і ніколі не было такога, каб яны своечасова не аплацілі за ўсе жыллёва-камунальныя паслугі. А тут раптам у пачатку 2005 года ў «жыроўках» выскачыла запазычанасць за падагрэў вады ў суме 40 500 рублёў. Адкуль яна ўзялася, калі я ўжо раней разлічыўся за ўсе паслугі? Каб высветліць усё, пайшоў у КЖРЭУП «Сельмашаўскае», прасіў паказаць нарматывы. Начальнік разліковай групы завёў мяне, апавядае далей Аляксандр Антонавіч, да энергетыка. Там шукалі іх, ды не знайшлі. Напэўна, прыхавалі, каб ніхто не ведаў. А потым мяне наогул, старога чалавека, выпхнулі адтуль. Вядома ж, разззлаваўся я, пачаў дабівацца праўды. Звярнуўся ў гарадскую жыллёва-камунальную гаспадарку, а там таксама разумення не знайшоў. Адным словам, мафія. Затым пісаў скаргі, каб быў наведзены парадак, каб не вадзілі за нос, і ў абласную пракуратуру, і ў абласны Камітэт дзяржаўнага кантролю, а толку ад гэтага няма. Карупцыя. Мала ганяюць чыноўнікаў, трэба — больш. А я ўжо баюся хадзіць па тых кабінетах, бо яшчэ што «прышыюць»: што, напрыклад, лаяўся ці быў п'яны. А то і да дзяцей дабяруцца, як з сынам было. Яго ў 43-гадовым узросце ў армію на зборы забіралі. За што?

Наконт сына Аляксандру Антонавічу тлумачэнне я даў адразу і, здаецца, ён зразумеў гэта. Па другім пытанні, пра жыроўкі пачатку 2005 года таксама ўспомніў: быў сапраўды нейкі пераразлік. Не толькі для іх шматпавярховіка, але і для ўсяго жыллёвага сектара горада. Таму, каб усё раскласці па паліцах, растлумачыць чалавеку самым дэталёвым чынам што да чаго, у наступны раз у сям'ю Агейчыка я з'явіўся разам з **вядучым эканамістам камунальнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельская гарадская ЖКГ» Наталляй ПАЛЕВІКОВАЙ.**

Аказваецца, Наталля Аляксееўна ведае Аляксандра Антонавіча. І ён яе таксама ведае. Бо сустракаліся раней, і тады яна, дарэчы, як і ў КЖРЭУП «Сельмашаўскае», яму ўсё тлумачыла, адкуль узяліся тыя 40 500 рублёў доўгу.

І ўжо пры мне вядучы эканаміст расказала, адкуль «выраслі ногі» ў вышэйпамянёнай запазычанасці, якую ну ніяк не хоча прымаць Агейчык. Мы разам разглядваем паперы па аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі, якія прадставіў Аляксандр Антонавіч, і пісьмовыя адказы яму камунальных службаў на скаргі ў адрас пракуратуры і Камітэта дзяржаўнага кантролю з табліцамі і тлумачэннямі.

Так, на працягу пэўнага часу, да лютага 2005 года ў Гомелі існавала практыка прад'яўлення плацяжоў за жыллёва-камунальныя паслугі ў бягучым месяцы за выключэннем падагрэву вады і ацяплення, плату за якія з чэрвеня 2004 года пачалі прад'яўляць за прайшоўшы месяц у сувязі з пераходам на новую методыку разліку (гэта значыць, за фактычнае спажыванне цеплавой энергіі). Такім чынам, у квітанцыях за студзень 2005 года была налічана плата за падагрэў вады за снежань папярэдняга года, а за астатнія паслугі — за студзень 2005 года. Таму ў лютым таго ж года насельніцтву ўсяго горада (а не толькі Агейчыку) было прад'яўлена да аплаты налічэнне за падагрэў вады за студзень, а ў квітанцыях за сакавік — налічэнні ўжо літаральна за ўсе жыллёва-камунальныя паслугі менавіта за мінулы месяц.

— Я атрымаў дзве квітанцыі за аплату падагрэву вады за адзін і той жа месяц, — не згаджаецца з вышэйназванымі аргументамі Аляксандр Антонавіч, — і лічу гэта двайным налічэннем. Яно ў яго «вісіць» і дагэтуль пры ўсім тым, што ўсе астатнія плацяжы Агейчык пакрывае своечасова. Пераканаць яго мы не змаглі. Між тым, Аляксандр Агейчык — нетыповы неплацельшчык, і такіх, як ён, нямнога.

*А наогул, ці многа маецца ўладальнікаў кватэр, якія не могуць ці не хочуць своечасова разлічвацца за атрыманыя паслугі? З гэтым пытаннем я звярнуўся да* ***начальніка аддзела жыллёвай гаспадаркі абласнога ўпраўлення ЖКГ ВАСІЛЮКА.***

*— Многа, — адказаў ён. — Мяркуйце самі. На пачатак гэтага года такіх было 40 665 чалавек, якія мелі пратэрмінаваную запазычанасць у суме 5514,5 мільёна рублёў. На 1 сакавіка лічбы змяніліся адпаведна на 41 095 чалавек і 5481,3 мільёна рублёў. Запазычанасць ад аднаго да трох месяцаў маюць 29 547, ад трох да шасці — 3889, ад шасці месяцаў да года — 2645, ад аднаго да трох гадоў і звыш трох гадоў — 3964 і 1054 чалавекі. Тая запазычанасць больш як у 5 мільярдаў рублёў — гэта амаль 10 працэнтаў таго, чаго нам не хапае для, калі так можна сказаць, паўнацэннай работы, забеспячэння ўсім неабходным. Таму і змагаемся з неплацельшчыкамі. Сёлета за два месяцы мы паслалі такім кватэранаймальнікам 11 423 папярэджанні на адключэнне вады і электраэнергіі (і ўжо іх пазбавіліся 2030 чалавек), падалі 483 натарыяльна афармленыя выканаўчыя прадпісанні на 176 мільёнаў рублёў і ўжо спагнана 72 мільёны з 209 кватэранаймальнікаў з іх зарплаты ці пенсіі. У суды ад нашых службаў паступіла 1227 іскаў на 543 мільёны рублёў і ўжо задаволена іх на 168 мільёнаў, якія заплачаны былі 337 кватэранаймальнікамі. Хочацца ж аднаго: каб тыя даўгі не ўтвараліся, каб кватэранаймальнікі дзейнічалі паводле прынцыпу: карыстаешся паслугамі — плаці за іх.*

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Прамая лінія

# Адрас дапамогі. Усім або нямногім?

**На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Валянціна Пятроўна СЯРГЕЕВА і начальнік аддзела па справах ветэранаў і пажылых людзей Іван Пятровіч НАГІБІН.**

**(Працяг. Пачатак у нумары за 3 красавіка.)**

☎ ***— Патлумачце, калі ласка, ці можна разлічваць на адрасную дапамогу ў выпадку, калі я працую ўсяго на палову стаўкі? І ці могуць прызначыць штомесячную дапамогу толькі на месяц?***

— У любым выпадку рашэнне аб прадастаўленні дзяржаўнай адраснай дапамогі прымаецца раённай камісіяй на падставе вывучэння ўсіх акалічнасцяў, па якіх чалавек апынуўся ў складаным становішчы. Пры гэтым калі працаздольны член сям'і нічога не робіць для павелічэння ўласнага даходу, камісія можа адмовіць у прызначэнні адраснай падтрымкі або прызначыць яе толькі на месяц.

☎ ***— Мяне завуць Сяргей, турбую з такой нагоды. Не сакрэт, што цяпер у многіх маладых сем'яў «не супадаюць» месца жыхарства і месца прапіскі. З улікам гэтага, хацелася б ведаць, куды ўсё ж трэба звяртацца ў падобнай сітуацыі па прызначэнне адраснай сацыяльнай дапамогі?***

— Трэба заўважыць, што з 1 студзеня гэтага года грамадзяне лічацца зарэгістраванымі па месцы жыхарства паводле пастаяннай прапіскі або па месцы знаходжання — паводле часовай прапіскі. Абавязак зарэгістравацца ўзнікае ў выпадку пераезду на новае месца жыхарства. А сам тэрмін такой рэгістрацыі вызначаны ў адзін месяц, адлік якога пачынаецца з дня прыбыцця на новае месца жыхарства.

Прычым дакументы на прызначэнне дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі можна падаваць па месцы як пастаяннай, так і часовай рэгістрацыі. Аднак тут адразу ж трэба папярэдзіць: у выпадку, калі чалавек ці сям'я звярнуліся па дзяржаўную адрасную падтрымку па месцы часовай рэгістрацыі, абавязкова будзе зроблены запыт інфармацыі — ці не зроблены такі ж зварот і па месцы рэгістрацыі пастаяннай.

☎ ***— Ці маюць права на адрасную дапамогу сем'і, дзе дзіця ва ўзросце да 18 гадоў не вучыцца, не працуе і не знаходзіцца на ўліку ў якасці беспрацоўнага? І ці з'явіцца магчымасць атрымліваць адрасную падтрымку ў выпадку, калі дзіця пойдзе ў вячэрнюю школу?***

— Паводле Закона «Аб занятасці насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь», грамадзяне, якія дасягнулі 16-гадовага ўзросту, могуць быць зарэгістраваныя ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў якасці беспрацоўных. Таму калі член сям'і ва ўзросце больш за 16 гадоў не вучыцца, не працуе і не з'яўляецца беспрацоўным, то права на адрасную дапамогу не будзе.

Што ж да другога пытання, то трэба заўважыць, што навучанне ў вячэрніх школах можа здзяйсняцца ў тым ліку без адрыву ад працоўнай дзейнасці. Таму для атрымання адраснай сацыяльнай дапамогі вучні вячэрніх школ павінны або працаваць, або знаходзіцца на ўліку ў якасці беспрацоўных.

☎ ***— Ёсць такое правіла: штомесячная адрасная дапамога не прызначаецца ў выпадку, калі адзін з членаў сям'і вучыцца на платным аддзяленні. Аднак ці прызначаць дапамогу, калі навучанне ў ВНУ адбываецца на платнай аснове і пры гэтым для аплаты навучання аформлены крэдыт?***

— У такіх варунках прэтэндаваць на адрасную сацыяльную дапамогу можна. Бо, паводле Указа № 616 ад 17 снежня 2002 года, вяртанне крэдыту робіцца з наступнага месяца пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы.

☎ ***— Ці можа мая дачка, якая даглядае брата-інваліда, атрымаць адрасную сацыяльную дапамогу з улікам таго, што мы ўсе жывём разам?***

**Людміла Віктараўна Марчанка,** *Хойніцкі раён.*

— Перш-наперш тут трэба высветліць: ці ведзяце вы сумесную гаспадарку. Так, калі вы, дачка і брат ведзяце агульную гаспадарку, права на адрасную падтрымку будзе вызначацца зыходзячы з даходаў трох чалавек. Калі ж дачка і брат вядуць адну, а вы — другую гаспадарку, павінны прымацца пад увагу толькі даходы дачкі і брата. Прычым у любым выпадку сам факт вядзення ці невядзення сумеснай гаспадаркі павінна вызначыць мясцовая камісія па прызначэнні адраснай сацыяльнай дапамогі. І, каб высветліць гэты факт, трэба звярнуцца ў раённыя органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

☎ ***— Наша сям'я — гэта я, муж і чацвёра дзяцей. Чаму пры прызначэнні адраснай дапамогі яе памер нам зменшылі на пэўны працэнт? Другое пытанне. Ці павінен уключацца ў даход сям'і крэдыт на куплю дома? І трэцяе. Колькі разоў у год можа прызначацца адрасная падтрымка?***

**Ірына Крэз,** *Астравецкі раён.*

— Усе навукоўцы сцвярджаюць, што пры пражыванні разам вялікай колькасці членаў сям'і атрымліваецца пэўная эканомія ад сумеснага выкарыстання бытавой тэхнікі, электраэнергіі, іншых даброт. Таму тут уведзены каэфіцыент уліку эфекту ад сумеснага пражывання. У прыватнасці, агульны даход сям'і з 5 чалавек дзеліцца на каэфіцыент 0,875, з 6 чалавек — на 0,866, з 7 чалавек — на 0,860 і г.д. Адсюль крыху павялічваецца ўліковы даход і, адпаведна, некалькі змяншаецца сам памер адраснай сацыяльнай дапамогі.

Што ж да крэдыту на куплю дома, то ў склад даходу сям'і ён не ўключаецца.

І па трэцім пытанні. Звычайна штомесячная дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога прызначаецца двойчы ў год тэрмінам на 6 месяцаў. Праўда, у выключных выпадках, калі па аб'ектыўных прычынах сям'я ці адзінокі чалавек выйсці з цяжкай матэрыяльнай сітуацыі не змаглі, паводле рашэння раённай камісіі адрасныя выплаты могуць прызначацца і на большы тэрмін.

**Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.**

**(Заканчэнне будзе.)**

# Ад мамы не ўцячэш



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

г.Мінск.

## Пастанова Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

### АБ ПАРАДКУ ДНЯ ВОСЬМАЙ СЕСІІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ТРЭЦЯГА СКЛІКАННЯ

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе**:

Зацвердзіць парадак дня восьмай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання (дадаецца).

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь В. ПАПОЎ.**

*2 красавіка 2008 г., г. Мінск.*
*№ 821-ПЗ/VIII*

*Дадатак да Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 02.04.2008 № 821-ПЗ/VIII*

# ПАРАДАК ДНЯ ВОСЬМАЙ СЕСІІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ТРЭЦЯГА СКЛІКАННЯ

1. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях прыватызацыі жылых памяшканняў і прызнанні страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь і асобных палажэнняў заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь».

2. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве».

3. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Народнай Рэспублікі Бангладэш аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве».

4. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях вышэйшай адукацыі».

5. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла аб адмене віз у дыпламатычных, службовых або афіцыйных пашпартах».

6. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла аб адмене віз у нацыянальных пашпартах».

7. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях рэкламы».

8. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі аб адмене віз для ўладальнікаў дыпламатычных і службовых або афіцыйных пашпартоў».

9. Аб праекце Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 г. № 1 «Аб стымуляванні вытворчасці і рэалізацыі тавараў (работ, паслуг)».

10. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб тэхнічным нарміраванні і стандартызацыі».

11. Аб праекце Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 2007 г. № 9 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў».

12. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях жыллёвых адносінаў».

13. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю».

14. Аб праекце Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб разглядзе пярэчання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на асобныя палажэнні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Водны кодэкс Рэспублікі Беларусь».

15. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змянення ў некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзейнасці адвакатаў».

16. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Баліварыянскай Рэспублікай Венесуэла аб супрацоўніцтве ў інтарэсах стварэння Адзінай сістэмы проціпаветранай абароны Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла і сістэмы радыёэлектроннай барацьбы Нацыянальных Узброеных Сіл Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла».

17. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Баліварыянскай Рэспублікай Венесуэла аб знаходжанні на венесуэльскай тэрыторыі беларускіх ваенных саветнікаў і спецыялістаў у інтарэсах стварэння Адзінай сістэмы проціпаветранай абароны Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла і сістэмы радыёэлектроннай барацьбы Нацыянальных Узброеных Сіл Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла».

18. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях абавязковага бясплатнага экзэмпляру дакументаў і бібліятэчнай справы».

19. Аб праекце Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2007 г. № 10 «Аб унясенні змяненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г. № 29».

20. Аб праекце Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 г. № 2 «Аб унясенні змянення ў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 лістапада 2003 г. № 24».

21. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змянення ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь».

22. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны і Крымінальна-выканаўчы кодэксы Рэспублікі Беларусь».

23. Аб праекце Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лютага 2008 г. № 3 «Аб некаторых пытаннях дзяржаўнага рэгулявання вытворчасці, абароту і рэкламы піва, алкагольнай прадукцыі і тытунёвых вырабаў».

24. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб іпатэцы».

25. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўнення ў Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь па пытанні накіравання спагнання на жылы дом або кватэру, абцяжараныя іпатэкай».

26. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб каштоўных металах і каштоўных камянях».

27. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ў некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях аўдытарскай дзейнасці».

28. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Праграмы супрацоўніцтва паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Індыя ў галіне культуры, мастацтва, адукацыі, сродкаў масавай інфармацыі і друку на 2007—2009 гады».

29. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да Пратакола па выбухованебяспечных перажытках вайны да Канвенцыі аб забароне або абмежаванні прымянення канкрэтных відаў звычайнай зброі, якія могуць лічыцца наносячымі празмерныя пашкоджанні або маючымі невыбіральнае дзеянне (Пратакол V)».

30. Аб праекце Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 снежня 2007 г. № 8 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 сакавіка 1999 г. № 11».

31. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях».

32. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ў некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзейнасці пракуратуры Рэспублікі Беларусь».

33. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях водпускаў асуджаных і выканання пакарання ў выглядзе канфіскацыі маёмасці».

34. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзейнасці органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь».

35. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў».

36. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўнення ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў для жыцця і здароўя чалавека».

37. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях адказнасці за парушэнне заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў».

38. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб чыгуначным транспарце».

39. Кадравыя пытанні.

---

*ЗАЎВАГА. У адпаведнасці з часткай другой артыкула 103 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адно пленарнае пасяджэнне ў месяц рэзервуецца для пытанняў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і адказаў членаў Урада Рэспублікі Беларусь.*


## ОАО «Белтрубопроводстрой»

### ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ

Выплата дивидендов по итогам работы Общества за 1 квартал 2008 года будет осуществляться по адресу: г. Минск, ул. Богдановича, 129 и почтовыми переводами.

**Справки по тел.: 017 334 30 31, 334 34 74.**

УНП 100364117



## ИНФОРМАЦИЯ ОАО «Стройтрест № 4» о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2007 год

| № п/п | Наименование показателей | Единица измер. | Отчетный период |
|---|---|---|---|
| 1. | Выручка от реализации продукции (работ, услуг) | млн руб. | 101 317 |
| 2. | Затраты на производство и сбыт реализованной продукции, оказание работ (услуг) | млн руб. | 74 406 |
| 3. | Бухгалтерская прибыль, всего | млн руб. | 2 748 |
| 4. | Чистая прибыль | млн руб. | 1 570 |
| 5. | Налоги и другие платежи из прибыли | млн руб. | 1 137 |
| 6. | Дебиторская задолженность | млн руб. | 21 134 |
| 7. | Кредиторская задолженность | млн руб. | 29 283 |
| 8. | Нераспределенная прибыль, всего | млн руб. | -876 |
| 9. | Направлено нераспределенной прибыли на увеличение уставного фонда | млн руб. | — |
| 10. | Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде, всего | млн руб. | 136,4 |
| 10.1 | дивиденды на одну акцию, начисленные в данном отчетном периоде | руб. | 164,67 |
| 11. | Дивиденды на одну акцию, выплаченные в данном отчетном периоде, всего | руб. | 188,33 |
| | в том числе: | | |
| 11.1. | по итогам предыдущего периода | руб. | 188,33 |
| 12. | Количество акционеров, всего | лиц | 2099 |
| | в том числе: | | |
| 12.1. | юридических лиц | лиц | 1 |
| 12.2. | физических лиц | лиц | 2098 |
| 13. | Среднесписочная численность работающих | чел. | 1990 |
| 14. | Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 11,6 |

Выплата дивидендов физическим лицам будет произведена в период с 11 по 20 мая 2008 года через отделения АСБ «Беларусбанк», ОАО «БПС-Банк» и кассы структурных подразделений. Дивиденды на акции, находящиеся в коммунальной собственности г. Минска, будут перечислены в городской бюджет в период с 20 апреля по 1 мая 2008 года.

**Справки по тел. 334 07 95.**

**Управляющий Н.Т. Шеремет**

**Главный бухгалтер И.А. Толстик**

УНП 100055368



*Организация*

## ОАО «ЛИДАПИЩЕКОНЦЕНТРАТЫ»

*Учетный номер плательщика: 500021268*
*Вид деятельности:*
*производство пищевых концентратов*
*Организационно-правовая форма: ОАО*
*Орган управления: КОНЦЕРН «БЕЛГОСПИЩЕПРОМ»*
*Единицы измерения: млн руб.*
*Адрес: 231300, г. Лида, ул. Тавлая, 11.*

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01. 2008 г.

| АКТИВ | Коды строк | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ | | | |
| Основные средства | 110 | 8589 | 9332 |
| Нематериальные активы | 120 | 7 | 6 |
| Доходные вложения в материальные ценности | 130 | | |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 1601 | 1784 |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | 1203 | 1357 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| ИТОГО по разделу I | 190 | 10197 | 11122 |
| II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 5123 | 5777 |
| в том числе: сырье, материалы и другие активы | 211 | 1956 | 2367 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | | |
| незавершенное производство и полуфабрикаты | 213 | 43 | |
| расходы на реализацию | 214 | 92 | 156 |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 1475 | 1208 |
| товары отгруженные | 216 | 1543 | 1987 |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | | |
| расходы будущих периодов | 218 | 14 | 20 |
| прочие запасы и затраты | 219 | | 39 |
| Налоги по приобретенным активам | 220 | 251 | 277 |
| Дебиторская задолженность | 230 | 1346 | 1364 |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 231 | 926 | 893 |
| поставщиков и подрядчиков | 232 | 187 | 268 |
| разных дебиторов | 233 | 67 | 40 |
| прочая дебиторская задолженность | 234 | 166 | 163 |
| Расчеты с учредителями | 240 | | |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд | 241 | | |
| прочие | 242 | | |
| Денежные средства | 250 | 115 | 336 |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 251 | | |
| Финансовые вложения | 260 | 30 | 10 |
| Прочие оборотные активы | 270 | 2 | |
| ИТОГО по разделу II | 290 | 6867 | 7764 |
| **БАЛАНС** | 300 | 17064 | 18886 |

| ПАССИВ | Коды строк | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ | | | |
| Уставный фонд | 410 | 29 | 71 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | | |
| Резервный фонд | 420 | 4 | 4 |
| в том числе: резервы, созданные в соответствии с законодательством | 421 | 4 | 4 |
| резервы, созданные в соответствии с учредительными документами | 422 | | |
| Добавочный фонд | 430 | 9926 | 10877 |
| Прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | | |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 450 | -107 | -114 |
| Целевое финансирование | 460 | 17 | 323 |
| Доходы будущих периодов | 470 | 43 | 1 |
| ИТОГО по разделу III | 490 | 9912 | 11162 |
| IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 900 | 1192 |
| Краткосрочные кредиты и займы | 520 | 3659 | 4360 |
| Кредиторская задолженность | 530 | 2593 | 2162 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 531 | 2195 | 1842 |
| перед покупателями и заказчиками | 532 | 16 | 17 |
| по оплате труда | 533 | 135 | 141 |
| по расчетам с персоналом | 534 | 3 | 1 |
| по налогам и сборам | 535 | 193 | 151 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 536 | 31 | |
| разных кредиторов | 537 | 16 | 5 |
| прочая кредиторская задолженность | 538 | 4 | 5 |
| Задолженность перед учредителями | 540 | | 10 |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 541 | | 10 |
| прочая | 542 | | |
| Резервы предстоящих расходов | 550 | | |
| Прочие виды обязательств | 560 | | |
| ИТОГО по разделу IV | 590 | 7152 | 7724 |
| **БАЛАНС** | 600 | 17064 | 18886 |

| Справочно из строки 530 | | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| | | 3 | 4 |
| Долгосрочная кредиторская задолженность | 601 | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 602 | 2593 | 2162 |

| АКТИВЫ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, УЧИТЫВАЕМЫЕ ЗА БАЛАНСОМ | Коды строк | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | | |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | 800 | 608 |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | 126 | 93 |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | | |
| Оборудование принятое для монтажа | 005 | | |
| Бланки строгой отчетности | 006 | | |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | | |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | | |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | 879 | 1085 |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | | |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | -9 | -6 |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | 57 | 60 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01.01.2007 г. по 31.12.2007 г.

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | Коды строк | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 18472 | 13919 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 4704 | 3348 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 020 | 13768 | 10571 |
| СПРАВОЧНО Из строки 010 – сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 12542 | 9503 |
| Управленческие расходы | 040 | | |
| Расходы на реализацию | 050 | 1017 | 696 |
| Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050) | 060 | +209 | +372 |
| II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ | | | |
| Операционные доходы | 070 | 436 | 318 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 071 | 43 | 52 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 080 | 393 | 266 |
| в том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование | 081 | 198 | 153 |
| от выбытия основных средств и нематериальных активов | 082 | 6 | |
| прочие операционные доходы | 083 | 189 | 113 |
| Операционные расходы | 090 | 248 | 136 |
| в том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование | 091 | 10 | 127 |
| от выбытия основных средств и нематериальных активов | 092 | 1 | |
| прочие операционные расходы | 093 | 237 | 9 |
| Прибыль (убыток) от совместной деятельности | 100 | | |
| Доходы (потери) от участия в уставных фондах других организаций | 110 | | |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090+/-100+/-110) | 120 | 145 | 130 |
| III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 91 | 100 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 5 | 10 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) | 140 | 86 | 90 |
| в том числе: от списания кредиторской задолженности | 141 | | |
| курсовые и суммовые разницы | 142 | | |
| безвозмездно полученные активы (включая денежные средства и суммы государственной помощи) | 143 | | |
| прочие внереализационные доходы | 144 | 86 | 90 |
| Внереализационные расходы | 150 | 243 | 365 |
| в том числе: от списания дебиторской задолженности | 151 | | 5 |
| курсовые и суммовые разницы | 152 | | |
| безвозмездно переданные активы (включая денежные средства) | 153 | | |
| прочие внереализационные расходы | 154 | 243 | 360 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | -157 | -275 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (060+/-120+/-160) | 200 | +197 | +227 |
| Налоги, сборы и платежи из прибыли | 210 | 191 | 174 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 220 | 4 | 25 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220) | 240 | 2 | 28 |
| СПРАВОЧНО (из строки 240) | | | |
| Сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 250 | | |

| СПРАВОЧНО (из строки 240) | Коды строк | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| | 2 | 3 | 4 |
| Количество организаций получивших прибыль | 260 | | |
| Сумма полученной ими прибыли | 260А | | |
| Количество организаций получивших убыток | 270 | | |
| Сумма полученного ими убытка | 270А | | |

**Генеральный директор Н.Н. Пекарский**

**Главный бухгалтер Н.И. Бурак**

УНП 500021268

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.



ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

КРАСАВІКА 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 14 (15518)

Алімпіядны рух

## Ні пуху, ні пер'я...

**Заключны фінальны этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных дысцыплінах прайшоў у Беларусі падчас вясновых канікулаў.**

Як паведамілі журналісту «Звязды» ў Міністэрстве адукацыі, сёлета ўдзел у першым этапе рэспубліканскай алімпіяды ўзялі больш як 648 тысяч чалавек, гэта на 12 працэнтаў больш, чым у мінулым навучальным годзе. 32 працэнты ўдзельнікаў першага этапу — навучэнцы сельскіх навучальных устаноў. На другім этапе (раённы ўзровень) узялі ўдзел больш як 75 тысяч чалавек. Увогуле па выніках другога этапу дыпломамі былі адзначаны больш за 16 тысяч навучэнцаў.

На трэці (абласны) этап трапілі 8845 чалавек, што на 7 працэнтаў больш, чым у папярэднім годзе. Пераможцамі трэцяга этапу алімпіяды сталі 2898 чалавек. Навучэнцы агульнаадукацыйных гарадскіх навучальных устаноў складаюць 31 працэнт ад агульнай колькасці пераможцаў, 16 працэнтаў — прадстаўнікі сельскіх навучальных устаноў, а астатнія з'яўляюцца прадстаўнікамі навучальных устаноў новага тыпу.

У Міністэрстве адукацыі з задавальненнем адзначаюць станоўчую дынаміку ўдзелу ў алімпіядным руху прадстаўнікоў прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Так, на трэцім этапе прадстаўніцтва навучэнцаў прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў павялічылася ў 1,5 раза, а колькасць пераможцаў — на 30 працэнтаў. Выніковасць удзелу навучэнцаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі на трэцім этапе павялічылася ў 1,7 раза (у 2007 годзе было 17 пераможцаў, а сёлета — 29). Значных поспехаў дабіліся навучэнцы Гомельскай, Магілёўскай абласцей і горада Мінска.

У заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды ўзялі ўдзел 1463 чалавекі. І менавіта з іх будуць пазней фарміравацца зборныя для ўдзелу беларускіх школьнікаў у міжнародных школьных алімпіядах. У мінулым годзе прадстаўнікі беларускай школы заваявалі на міжнародных алімпіядах 28 медалёў — без узнагарод не застаўся ніводны член нашых зборных. Да таго ж у заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па рускай мове і літаратуры ўдзельнічалі таксама прадстаўнікі Бранскай (Расія) і Чарнігаўскай (Украіна) абласцей, а па матэматыцы — літоўскія школьнікі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Брэйн-рынг... паміж вучнямі і настаўнікамі

**Падлеткавая злачыннасць, на жаль, сёння становіцца паўсядзённай бядой. Педагогі Сямёнавіцкай сярэдняй школы Уздзенскага раёна ўсур'ёз узяліся за выкараненне гэтай з'явы. Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Ала Быліна і педагог-арганізатар Алена Чыгір распрацавалі сацыяльна-выхаваўчы праект «Раскрый сваё сэрца», мэта якога — стварыць эфектыўную сістэму маральна-прававога выхавання моладзі.**

Праект створаны па ўласнай ініцыятыве педагогаў. А штуршком да яго паслужыў той факт, што ў раёне — досыць высокі ўзровень падлеткавых правапарушэнняў.

— Вось мы і задумалі гэты праект, — гаворыць намеснік дырэктара школы Ала Эдуардаўна. — Ён распрацаваны як непасрэдна для школьнікаў, так і для іх бацькоў.

Дзейнічае шэраг формаў яго рэалізацыі: арганізацыя гурткоў па інтарэсах, пазнавальных экскурсій, сустрэч з ветэранамі, святочных канцэртаў для іх, дапамога дзецям-інвалідам і дзецям-сіротам...

Другая, не менш значная акцыя педагога-арганізатара А. Чыгір «Зробім свет цудоўным!» прадугледжвае дызайнерскае добраўпарадкаванне школьнай тэрыторыі, гаспадарчых дворыкаў. Тут задзейнічаны валанцёрскі атрад «Рабінзоны» — добраахвотнікі з ліку піянераў школы. Будзе добраўпарадкаваны сквер вакол сельскага ДК, пасаджана алея... У працу ўключацца бацькі і, безумоўна ж, настаўнікі. Круглы год вядзецца добраўпарадкаванне прышкольнай тэрыторыі.

Школа перайначваецца. Новыя камп'ютары, Інтэрнэт, новая акустычная сістэма, абноўлены будынак... Сапраўдная школа аграгарадка. Школа праводзіць дыскатэкі. Кожная другая субота — дзень здароўя: спартыўныя мерапрыемствы, паходы ў лес, інтэлектуальныя гульні...

— Хутка адбудзецца «Брэйн-рынг» паміж вучнямі і настаўнікамі на тэму «Мы за здаровы лад жыцця», — паведамляе Ала Эдуардаўна. — Станоўчыя вынікі праектаў можна назіраць ужо сёння. Дзеці актыўна бяруць удзел у розных выхаваўчых мерапрыемствах.

**Дзмітрый ФЕДЧАНКА, студэнт журфака БДУ.**
*Уздзенскі раён.*

Лідарскі дар

# БІЗНЭС ЯК ХОБІ

Новы герой нашай пастаяннай рубрыкі ўхітраецца ў вольны ад асноўнай працы час займацца бізнэсам



Нядаўнім папаўненнем байнэту — жаночым парталам women.by — кіруе, увага, мужчына! Прычым вельмі малады, можна сказаць юны. 23-гадовы Павел Адамовіч летась скончыў Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (факультэт выдавецкай справы і паліграфіі) і працуе па спецыяльнасці, а Інтэрнэт-праектам займаецца... у вольны час! Такое вось хобі! Прычым далёка не адзінае: кола інтарэсаў маладога кіраўніка надзвычай шырокае — ён цікавіцца рэкламай, графічным дызайнам (у першую чаргу распрацоўкай фірмовага стылю), любіць спорт (яшчэ нядаўна займаўся тайскім боксам, аднак цяпер часу на гэта застаецца ў кіраўніка ўсё менш) і не можа жыць без музыкі. Аматар падарожжаў, Павел можа і звычайную паездку ў транспарце ператварыць у прыемную вандроўку:

— Дарога раніцай на працу, а ўвечары дадому — гэта якраз тыя 1,5 гадзіны ў дзень, калі адчуваеш сябе абсалютна свабодным ад усіх спраў. Чым не падарожжа?

### «Для жанчын ніякіх сілаў не шкада!»

Ці не дзіўна, што мужчына раптам вырашыў зрабіць партал для жанчын, дзе яны змаглі б абмеркаваць апошнюю серыю любімага серыяла ці пахваліцца абноўкамі, купленымі на распродажы, або магічным дзеяннем чарговай дыеты? Цяжкавата прадугледзець, чаго хочуць жанчыны, пры тым, што яны самі маюць аб гэтым туманнае ўяўленне... Чаму б не паспрабаваць з мужчынскім Інтэрнэт-рэсурсам — пра аўтамабілі, спорт, рыбалку з паляваннем ды... жанчын?

— Па-першае, для мужчын ужо існуе дастаткова рэсурсаў у байнэце, — патлумачыў Павел. — Па-другое, мужчыны не маюць такой патрэбы ў гутарцы на форумах, зборы карыснай інфармацыі, онлайн-дапамозе ў любых жыццёвых пытаннях, як жанчыны. Таму большасць ідэй, якія можна рэалізаваць на партале, на жаль, не знойдуць аніякага водгуку ў мужчынскім асяродку.

Як увогуле ўзнікла сама ідэя жаночага партала?

— Надта хацелася пазнаёміцца з самымі чароўнымі дзяўчатамі! Жартую! Насамрэч ідэя ўзнікла выпадкова. Штогод я ламаю галаву над тым, што падарыць сваім любімым жанчынам — матулі, каханай дзяўчыне, сяброўкам. Заўжды хочацца іх здзівіць, прыдумаць нешта незвычайнае і з кожным годам задумы становяцца ўсё глабальней! Летась я якраз займаўся распрацоўкай web-сайтаў і падумаў: чаму б не спалучыць прыемнае з карысным і зрабіць маштабны падарунак усім жанчынам — жаночы сайт?! Вядома ж, да леташняга свята я ўжо не паспяваў, аднак задаўся мэтай здзейсніць задуманае да 8 сакавіка 2008 года. Як бачыце, атрымалася! Зразумела, гэта не далося лёгка: шмат часу заняла распрацоўка стратэгіі рэкламнай кампаніі, бо ад таго, якім чынам першапачаткова падаецца інфармацыя, вельмі істотна залежыць лёс праекта, ды і сама падрыхтоўка да афіцыйнага адкрыцця — спачатку распрацоўваліся структура і дызайн сайта, потым праграмная частка. Разумееце, хацелася зрабіць унікальны праект, які пры гэтым быў бы прыгожым і радаваў жаночае вока (а яно ой якое патрабавальнае!). Таму варта было распрацаваць прывабны дызайн, зручную і простую ва ўжыванні навігацыю, ну а галоўнае — падмацаваць усё гэта цікавым, арыгінальным і карысным напаўненнем. Натуральна, зрабіць такую «цукерку» было няпроста, аднак праблемы нават не хочацца ўзгадваць — для жанчын ніякіх сілаў не шкада! Партал знайшоў жывы водгук у дам — і гэта галоўнае, пагадзіцеся. За першыя два тыдні існавання форуму на ім было зарэгістравана больш за 80 чалавек і напісана каля 1100 паведамленняў.

> Ужо праз два дні пасля афіцыйнага адкрыцця на жаночым сайце штодзень з'яўлялася звыш 200 наведвальнікаў (ці наведвальніц?).

### Месца сустрэчы ўсіх беларусак

— Партал women.by створаны для ўсіх жанчын, аднак найперш — для беларускіх, — кажа Павел Адамовіч. — Гэта не пошук старых сяброўак ці аднакласніц — такіх рэсурсаў хапае. Наша мара, ці хутчэй, мэта — аб'яднаць усіх беларусак у сетцы Інтэрнэт. Чаму не? Жанчыны, якія жывуць у адной краіне змогуць падзяліцца рэальнай інфармацыяй пра паслугі — шопінг, лячэнне, адукацыю: адна адной параяць медыцынскі цэнтр ці салон прыгажосці, краму ці курсы, якія ім прыйшліся даспадобы. Нашы наведвальніцы — жанчыны розных узростаў і прафесій, з рознымі інтарэсамі і поглядамі — яны могуць абменьвацца карыснай інфармацыяй, дзяліцца вопытам. У нас наладжана трывалая зваротная сувязь — мы аператыўна рэагуем на ўсе заўвагі, прапановы і пажаданні нашых гасцяў. Жанчыны актыўна дыскутуюць на форуме, дарэчы, там рэгіструюцца і мужчыны — ім, відаць, карціць раскрыць усе жаночыя тайны.

У планах маладога лідара — зрабіць жаночы партал самым любімым рэсурсам беларусак, месцам сустрэчы для дзяўчат з усіх куткоў краіны.

— Мы працуем над тым, каб сайт станавіўся ўсё больш цікавым і інтэрактыўным, — запэўніў нас кіраўнік-пачатковец, — планаў шмат, і я не буду пакуль раскрываць усіх сакрэтаў, але магу сказаць, што ў самым хуткім часе ў распараджэнні нашых удзельніц будуць асабістая электронная пошта, Інтэрнэт-дзённікі, фотагалерэі. Галоўнае, каб у выніку кожная жанчына атрымала свой партал — з наборам патрэбных ёй рэсурсаў — непаўторны, зручны і карысны.

### Абаянне — гэта дар

— Быць маладым кіраўніком і лёгка, і складана адначасова. Амбіцыі і свежы погляд на рэчы, вядома ж, дапамагаюць у працы, — упэўнены Павел Адамовіч. — А вось праблема кожнага кіраўніка-пачаткоўца ў тым, што яму трэба ўвесь час пацвярджаць сваю кампетэнтнасць усім, з кім даводзіцца працаваць, — і падначаленым, і партнёрам па бізнэсу. Каб заваяваць іх давер, трэба запасціся цярпеннем, пастаянна працаваць, асвяжаць свае веды, папаўняць іх. Кіраваць персаналам можна, як мінімум, двума спосабамі: прымусіўшы працаўнікоў выканаць нейкае заданне ці зацікавіўшы іх. Мне падаецца, што другі спосаб — больш дзейсны. Каб зацікавіць падначаленых працай, трэба самому ёй цікавіцца, выдатна разбірацца ў людзях, знаходзіць падыход да любога чалавека, быць здольным мякка і пры гэтым настойліва ўтрымліваць свае пазіцыі. Кіраўніку з прыродным абаяннем заўсёды прасцей працаваць, ён атрымлівае неабходныя вынікі з меншымі намаганнямі, але такі дар ёсць далёка не ў кожнага, і таму большасці кіраўнікоў неабходна доўга ўсяму вучыцца.

Пры ўсёй абаяльнасці да 23-гадовага Паўла Адамовіча часам ставяцца скептычна. Як з гэтым змагацца такім жа, як ён, маладым кіраўнікам?

— Калі справа выключна ў перадузятасці больш сталых калег, а не ў вашым непрафесіяналізме, то варта проста не прымаць гэта блізка да сэрца і старанна працаваць, — раіць Павел. — Людзі з часам зменяць сваё стаўленне — перастануць канцэнтравацца на ўзросце і пачнуць заўважаць вашы дзелавыя здольнасці. А вось калі прычына скепсісу ў вашай рассеянасці, лянотце, пустаслоўі, то ад іх трэба як мага хутчэй пазбаўляцца! Першы крок на шляху да поспеху — навучыцца кіраваць сабой і рацыянальна арганізоўваць працоўны дзень. Завядзіце штодзённік, запісвайце там разгорнутыя планы — фіксуйце ўсё да дробязяў, вядзіце строгі ўлік дакументаў. Калі вас чакае гутарка з падначаленымі ці партнёрамі па бізнэсу, пастарайцеся прадумаць магчымы сцэнарый размовы загадзя. Сачыце за тым, што гаворыце і як гаворыце, не забывайцеся пра ўдалы знешні выгляд — для кіраўніка ён асабліва важны.

### Быць лідарам

— Упэўнены, што любы актыўны, прадпрыімлівы чалавек, які імкнецца нешта зрабіць, — ужо лідар, — даводзіць Павел. — Ёсць лідарскія здольнасці і ў мяне. *(Усміхаецца.)* Галоўнае тут — ведаць, чаго хочаш і на што дзеля гэтага гатовы пайсці. А калі мэты няма, то ніякія лідарскія якасці не зробяць цябе добрым кіраўніком. Я перад сабой мэту бачу, і не адну! Яшчэ столькі ўсяго наперадзе, таму ў планах — усё жыццё, і гэтыя планы — частка мары: займацца любімай справай, а пры гэтым няблага было б мець час і сродкі на хобі, падарожжы і ўсякія прыемнасці.

**Ала МАЧАЛАВА.**

Рэспубліканскі студэнцкі форум

# АЗДАРАЎЛЕННЕ МОЖА СТАЦЬ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ БОЛЬШ ДАСТУПНЫМ

**Напэўна ніхто не стане аспрэчваць той факт, што студэнцтва сёння — не толькі самая крытычна настроеная частка нашага грамадства (як і любога іншага), але і самая ініцыятыўная, самая сацыяльна актыўная яго частка. І гэта яшчэ раз пацвердзіў Рэспубліканскі студэнцкі форум, які прайшоў нядаўна ў сценах Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта і сабраў 260 прадстаўнікоў 53 беларускіх ВНУ — актывістаў і лідараў студэнцкага самакіра-вання, пярвічных арганізацый БРСМ, прафсаюзных актывістаў, маладых навукоўцаў, спартсменаў і г.д.**

Мэтай форуму была арганізацыя зацікаўленага дыялогу паміж органамі дзяржаўнай улады і кіравання і студэнцтвам па праблемах сацыяльнай абароненасці студэнцкай моладзі, пашырэння яе ўдзелу ў вырашэнні эканамічных, сацыяльных і культурных праблем грамадства, садзейнічанне развіццю студэнцкага самакіравання, удасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу і навукова-даследчай работы студэнтаў. Трэба зазначыць, што пасля правядзення ў Беларусі першага Рэспубліканскага студэнцкага форуму сустрэчы міністра адукацыі з прадстаўнікамі беларускага студэнцтва паспелі пераўтварыцца ў добрую традыцыю. Прычым нават цяжка вызначыць, для каго яны больш цікавыя: для маладых людзей, якія асабіста могуць задаць прадстаўнікам Міністэрства адукацыі хвалюючае іх пытанне, ці для кіраўнікоў міністэрства, у якіх з'яўляецца ўнікальная магчымасць убачыць тую ці іншую злабадзённую праблему зусім з іншага боку. А што, скажыце, можа быць важней за прадукцыйны дыялог? Тым больш што ўсе пытанні і прапановы, якія гучаць на падобных сустрэчах, заўсёды маюць зваротную рэакцыю: знаходзяць сваё адлюстраванне ў нарматыўна-прававых дакументах або ў выглядзе адказаў на пытанні ў друку ці на сайце Міністэрства адукацыі.

А спектр праблем, якія непакояць студэнтаў, традыцыйна вельмі шырокі. Вось і на гэты раз **міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ амаль дзве гадзіны адказваў на пытанні, што паступалі ад дэлегатаў форуму з залы.** Ці спрыяе ўвядзенне цэнтралізаванага тэсціравання паляпшэнню якасці ведаў? Ці будзе змяншацца набор на першы курс ВНУ ў сувязі з дэмаграфічнай ямай? Ці плануецца ўвядзенне прафесійнага тэсціравання пры паступленні на педагагічныя спецыяльнасці? З чым звязана істотнае павышэнне платы за навучанне ў ВНУ? Чым выклікана значнае скарачэнне гадзін на вывучэнне студэнтамі замежнай мовы? Ці будуць змяняцца правілы паступлення ў магістратуру і аспірантуру? Цікавіліся студэнты таксама адносінамі міністра адукацыі да ўвядзення рэйтынгавай сістэмы і наяўнасцю нарматыўна-прававой базы па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, перспектывамі школьнай рэформы і нават магчымасцямі стварэння праграм па педагагічным выхаванні бацькоў навучэнцаў.

— Будзем разам думаць, як нам дапамагчы бацькам,— парыраваў міністр.

Хтосьці са студэнтаў пацікавіўся магчымасцю размеркавання ў Венесуэлу.

— Хоць і далекавата, але пэўныя дамоўленасці аб супрацоўніцтве ў нас з Венесуэлай ёсць. Праўда, у гэтай краіне патрэбна веданне іспанскай мовы. А па ўсёй Беларусі іспанскую мову вывучаюць толькі 1734 школьнікі, — адказаў на пытанне Аляксандр Радзькоў.

Усім вядома, што вестак аб павышэнні стыпендыі студэнты чакаюць з асаблівай нецярплівасцю. Але павелічэнне вучэбных стыпендый ажыццяўляецца толькі пасля павелічэння тарыфнай стаўкі першага разраду (летась, напрыклад, стыпендыя павышалася толькі аднойчы).

— У мяне часта пытаюцца, як можна пражыць за стыпендыю? Я хачу вас запэўніць, што на стыпендыю ніхто і ніколі ні ў адной краіне не змог пражыць. Стыпендыя — гэта толькі дзяржаўная падтрымка. Шукайце спосабы для сваёй рэалізацыі, — параіў міністр. — Працуйце летам у будаўнічых атрадах. Тым больш што ўрад дапамагае кожны год студэнцкай моладзі з пошукам аб'ектаў, дзе патрабуюцца іх рукі. Дарэчы, калі раней прызначалася сто так званых прэзідэнцкіх стыпендый, то цяпер іх колькасць павялічылася ўдвая. І мы не можам знайсці на іх годных прэтэндэнтаў.

Яшчэ адна балючая тэма — забеспячэнне студэнтаў месцамі ў інтэрнатах. Дэфіцыт на сёння складае каля 23 тысяч месцаў. Асабліва востра гэта праблема стаіць перад студэнтамі сталічных вышэйшых навучальных устаноў. Арэнда жылля ў сталіцы «кусаецца», а сума кампенсацыі за наём студэнтамі жылля выглядае проста смешна.

— Вы павінны зразумець, што мы ніколі не зможам з дзяржаўнага бюджэту кампенсаваць вам кошт наёмнага жылля. Таму мая парада ўсім: зусім неабавязкова імкнуцца ехаць на вучобу ў Мінск. Паверце, што ў Брэсце, Гомелі ці Магілёве вы атрымаеце адукацыю не горшую, чым у сталіцы, — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў.

**Старшыня Рэспубліканскага савета старшыняў прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА** паведаміў, што прафсаюз дабіваецца вызвалення ад падатку грамадзян, якія здаюць жыллёвыя памяшканні студэнтам і навучэнцам. Рашэнне дадзенай праблемы дазволіла б легалізаваць гэты від арэнды, і магчыма, нават знізіць цэны на яе. Так, раней ад выплаты падаходнага падатку былі вызвалены грамадзяне, якія здаюць жыллё маладым спецыялістам. І гэта можна аднесці да дасягненняў прафсаюзаў.

Прафсаюзу ўдалося таксама дабіцца захавання дацыравання са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва студэнцкіх санаторыяў-прафілакторыяў. Больш за тое, у 2003—2005 гадах былі ўведзены ў строй два новыя санаторыі-прафілакторыі ВНУ. Такім чынам, сёння дзейнічаюць ужо 16 студэнцкіх санаторыяў-прафілакторыяў. Аднак ахапіць аздараўленнем усіх студэнтаў усё роўна праблематычна. Таму сёння абмяркоўваецца пытанне аб прадастаўленні студэнтам датацый на аздараўленне ў іншых профільных санаторыях. Гэта вельмі актуальна, таму што з кожных 100 студэнтаў добрым здароўем могуць пахваліцца толькі 27 чалавек. Да таго ж Міністэрства аховы здароўя пагадзілася перагледзець пералік паказанняў для накіравання студэнтаў у санаторый-прафілакторый. Ён будзе пашыраны, і санаторна-курортную карту змогуць атрымаць нават тыя студэнты, якія не маюць сур'ёзных хранічных захворванняў, але якім патрабуецца аздараўленне.

Нядаўна Саветам Міністраў была зацверджана пастанова «Аб парадку аказання матэрыяльнай дапамогі на праезд навучэнцам і студэнтам дзяржаўных устаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі». Згодна з гэтым дакументам частковая кампенсацыя кошту праезду прадугледжана толькі за паездкі на прыгарадным і міжгароднім транспарце. А гарадскі пасажырскі транспарт увогуле ў гэтым дакуменце не згадваецца.

— Цяпер мы рыхтуем прапановы ў адрас Мінгарвыканкама, абласных выканаўчых камітэтаў і абласных Саветаў дэпутатаў з просьбай разгледзець пытанне аб скідках на праезд для навучэнскай моладзі ў гарадскім грамадскім транспарце, — паведаміў Раман Дапіра. — Гэта было б правільна. Яны заўсёды дацыравалі свой гарадскі транспарт і нейкую скідку маглі б студэнтам прадаставіць. Тым больш што ў Мінску нярэдка для таго, каб дабрацца да месца вучобы, практыкі ці заняткаў фізкультурай трэба скарыстацца трыма відамі транспарту.

Цікавіла ўдзельнікаў студэнцкага форуму і вялікая розніца ў аплаце працы маладых спецыялістаў з медыцынскай і педагагічнай адукацыяй і, скажам, з эканамічнай адукацыяй ці выпускнікоў будаўнічых спецыяльнасцяў. А таксама якія сродкі ў Дзяржаўнай праграме развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі прадугледжаны для павышэння заработнай платы выкладчыкаў? Да таго ж, на думку некаторых студэнтаў, паспяховасць выпускніка ВНУ таксама павінна неяк улічвацца пры налічэнні зарплаты. Ёсць усё ж розніца, хто прыходзіць на прадпрыемства і з якім багажом ведаў за плячыма.

Аляксандр Радзькоў падтрымаў выказаную заклапочанасць «вымываннем» педагогаў-мужчын з сістэмы адукацыі і паведаміў, што міністэрства ўжо выйшла ва ўрад са сваімі прапановамі наконт павышэння зарплат педагогам, у тым ліку і маладым спецыялістам. «Я ўвогуле лічу, што больш за астатніх павінны зарабляць прадстаўнікі тых прафесій, якія бліжэй за ўсіх стаяць да чалавека. Як гэта адбываецца ва ўсім свеце...», — прызнаўся міністр. А Раман Дапіра паведаміў, што цэнтральныя і тэрытарыяльныя прафсаюзныя органы рэгулярна праводзяць экспертызу калектыўных дагавораў, накіраваную у тым ліку і на выяўленне ў іх «антымаладзёжных пазіцый», да якіх адносяцца абмежаванне правоў новых работнікаў на атрыманне матэрыяльнай дапамогі, устанаўленне надбавак, прэміраванне на працягу пэўнага часу іх працы і г.д. Больш за тое, прафсаюз дабіўся пашырэння гарантый для моладзі. Напрыклад, у сістэме адукацыі і навукі кантракт з маладым спецыялістам заключаецца толькі з яго згоды, а гэта значыць, што большасць з іх працуюць на ўмовах бестэрміновага працоўнага дагавора.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Алена ФІЛІПАВА:

# «Малады чалавек прывык, што звычайна я ў сіняках»

**Для мяне так і застанецца загадкай, што можа прымусіць дзяўчыну займацца вольнай барацьбой. Занятак не звышпрыбытковы, як тэніс, не такі папулярны, як фігурнае катанне, адным словам, той яшчэ спорт. Памятаеце, дзюдаіста Ігара Макарава пасля «залатога» паядынку на Алімпіядзе — з фінгаламі і акрываўленым тварам? Прыкладна так і выглядаюць пасля спаборніцтваў барцы. У чым сэнс пакутаў, я і спытала ў Алены Філіпавай, прызёркі чэмпіянату свету і Еўропы, пераможцы сёлетняга міжнароднага турніру па вольнай барацьбе на прызы Аляксандра Мядзведзя.**



*Алена ФІЛІПАВА (у цэнтры) разам са сваімі сяброўкамі-спартсменкамі Наталляй ШЫНКАРЭВІЧ і Надзеяй МІХАЛКОВАЙ.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**— Алена, на мой погляд, вольная барацьба — бадай, самы нежаночы від спорту.**

— У нас у Беларусі, між іншым, дзесьці 150 ці нават 200 дзяўчат займаецца гэтым спортам. Мужчына водзіць машыну і жанчына водзіць. Гэтак жа мужчыны борацца, чаму б і жанчыне не пабароцца? Асабіста я спачатку займалася таэквандо. А аднойчы пасля трэніроўкі ўбачыла, як займаліся барцы, і штосьці мне падказала, што гэта маё. З таго часу прайшло дзевяць гадоў...

**— Штангу паднімаеце, у трэнажорнай зале займаецеся?**

— Зусім няшмат. Усё ад прыроды дадзена. Барацьбой можна займацца любому — у наш від бяруць як высокіх і вялікіх, так і маленькіх і худых.

**— Вагу даводзіцца набіраць ці наадварот, пазбаўляцца?**

— Перад спаборніцтвамі, калі я важу, напрыклад, 59, то чатыры кілаграмы трэба скінуць, каб упісацца ў сваю вагавую катэгорыю. Я дзень-два не ем. А пасля ўзважвання зноў трэба крыху набраць, каб сілы, якія я патраціла для згонкі, зноў з'явіліся, і я магла бароцца.

**— Для дзяўчат, здаецца, жудаснае паняцце «набіраць вагу».**

— Для нас гэта самае прыемнае. Скінуць куды складаней. Паболей мяса і садавіны, каб мышцы не забіваліся, вады паменей, каб рукі не ацяклі. Звычайна ў дзень мы выпіваем 3—4 літры, а калі худзееш, змяншаеш да літра.

**— Фігуры не шкада?**

— У нас ва ўсіх нармальныя фігуры — падцягнутыя, нічога лішняга. У нас ёсць дзяўчаты з выдатнымі мадэльнымі данымі, толькі крыху росту не хапае. Адзіны недахоп у спартсменаў, якія займаюцца вольнай барацьбой — ад стойкі ногі могуць быць крыху колам. Але толькі ў тых, у каго першапачаткова была невялікая крывізна.

**— У моцнай паловы, як правіла, неадназначнае стаўленне да спартыўнай жаночай фігуры...**

— Адразу пачынаюць цікавіцца, чым займаешся: лёгкай атлетыкай? Плаваннем? Гімнастыкай? А я адказваю: не, барацьба. Усе вельмі здзіўляюцца: няўжо і сапраўды барацьбой? А летам ідзеш у маечцы і побач з табой ідзе хлопчык які-небудзь худзенькі — выглядае ненатуральна.

**— Адкуль у цябе такі загар?**

— Я перад турнірам Мядзведзя ў салярый хадзіла.

**— Гэта абавязкова?**

— Ды не. Прыехалі на збор, лячыцца мне не трэба было, вырашыла схадзіць у салярый. Гэта выключна для сябе.

**— Ёсць асаблівыя патрабаванні да знешняга выгляду перад спаборніцтвамі?**

— Усе ўпрыгажэнні мы здымаем перад трэніроўкай. Ну і пазногці нельга доўгія, бо можна падрапаць саперніцу, мы самі адна адну праўляем. Ды і самой нязручна: завушніцы адзеў — адарвуць разам з вухам. А валасы, безумоўна, пакутуюць, як ні заколвай. З падлогі пасля спаборніцтваў можна на парык назбіраць. Але ўсе мы прызвычаіліся.

**— А як выглядаеш пасля схваткі?**

— І з драпінамі, і з фінгаламі, і з шышкамі. Робіш прыём і выпадкова то аб калена, то аб плячо, ці нават галаву ўдарышся. Мы да гэтага прызвычаіліся. Па горадзе ідзеш і ловіш на сабе погляды незразумелыя, быццам ты алкаголік. Таму стараемся замазаць танальным крэмам.

**— Касметыкай карыстаешся?**

— Вельмі рэдка. Напрыклад, калі іду ў міністэрства ці калі якоенебудзь кіраўніцтва спартсменаў запрашае. Мой малады чалавек прызвычаіўся, што я звычайна ў сіняках, касметыка тут не да месца.

**— Робячы спартыўную кар'еру ці ёсць час на асабістае жыццё?**

— Вядома ж, ёсць. Адна спартсменка ў нас замужам, прычым яе муж не мае ніякага дачынення да спорту. Яшчэ адна паспела нават развесціся з мужам. Мой хлопец таксама са спортам не звязаны, мы разам калісьці вучыліся ў школе. У нас агульныя захапленні: я люблю верхавую язду, і ён любіць, я люблю пастраляць, і ён таксама. Бачымся мы ў асноўным па выхадных, шмат размаўляем па тэлефоне, у месяц тысяч 300 на гэта трачу.

**— Такія нежаночыя твае захапленні, магчыма, звязаны з тым, што бацькі марылі пра хлопчыка, а нарадзілася дзяўчынка?**

— Наўрад ці мае бацькі замест мяне хацелі хлопчыка... У мяне пяць братоў і адна сястра, я пятая. Я шмат жыла ў бабулі ў вёсцы, напэўна, таму ў мяне і захапленні такія. У бабулі з дзядулем у мяне нават ёсць свой конь. Пакуль мяне няма, яны яго даглядаюць, а калі ёсць вольны час, я стараюся прыязджаць. У вёсцы і пастраляць можна з ружжа. Я і на паляванне хадзіла, і на рыбалку. У Мінску ў цір аднойчы пайшлі ў парку Чалюскінцаў з дзяўчатамі. Я ўвесь час траплялa, усе наведвальнікі падумалі, што я займаюся стральбой.

**— За мяжой па магазінах любіш хадзіць?**

— Набываю там штосьці ў асноўным не для сябе, а тое, што просяць знаёмыя. З Францыі, напрыклад, прасілі прывезці каву, французскага віна, духі. Для сябе набываю сувеніры — паштоўкі, статуэткі. Краіны часта паўтараюцца, у Балгарыі былі разоў пяць. Аднойчы пабывалі ў Іспаніі, паездка запомнілася тым, што трэнер сабраў нас усіх і мы паехалі на акіян. Гватэмала запомнілася ў асноўным самалётам. Мы іх змянілі чатыры, толькі ў адным ляцелі 11 гадзін. Там праходзіў юнацкі чэмпіянат свету. Адных нас нікуды не адпускалі, перамяшчаліся толькі ў аўтобусе, і тое пад аховай. З акна бачылі, як людзі з нажамі, дубінкамі, зброяй ходзяць па вуліцах. У Гватэмале, дарэчы, у якасці сувеніра набыла нацыянальны касцюм.

**— Куды б хацела паехаць на адпачынак?**

— Мне больш за ўсё падабаецца ў Мінску. Гэта, напэўна, самы чысты горад з усіх сталіц, дзе я пабывала. І атмасфера своеасаблівая. Паездкі на спаборніцтвы і зборы так надакучваюць, што ехаць яшчэ кудысьці на адпачынак зусім не хочацца. Калі палічыць, то за год я ад сілы месяц бываю дома. У адпачынку я езджу да бабулі.

**— У жыцці карысталася сваімі ўменнямі?**

— Аднойчы ў школе заступілася за малодшага брата. Ён быў маленькі, у чацвёртым класе, а я ў восьмым. І старшакласнік яго зачапіў, я ўжо дакладна і не памятаю, у чым была справа. Гэты хлопец быў вышэйшы за мяне, але я падняла яго адной рукой каля сценкі і сказала: «Яшчэ раз закранеш, атрымаеш!» З той пары маіх малодшых братоў у школе ніхто не крыўдзіў.

**— Баі без правілаў разглядаеш як варыянт прадаўжэння кар'еры?**

— Хлопцам, якія займаюцца вольнай барацьбой, у гэтым плане прасцей. Некаторыя і сапраўды выступаюць у баях без правілаў. За мяжой яны вельмі распаўсюджаны, прычым і жаночыя. Не ведаю, ці пайшла б у такога кшталту шоў. Справа ў тым, што першая я не магу нікога ўдарыць. Калі мяне крыўдзяць, я часам і прамаўчаць магу ці зрабіць выгляд, што не чула...

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**




## Усміхнёмся!

*Урок біялогіі. Настаўніца:*
*— Вовачка, раскажы класу, як размнажаюцца дажджавыя чарвякі?*
*— Дзяленнем, Антаніна Пятроўна.*
*— А падрабязней?*
*— Рыдлёўкай.*

☺

Да дырэктара заапарка падыходзіць наведвальнік:
— Чаму ў вас тыгр нейкі ненатуральны і пастаянна гарлапаніць?
— Разумееце, тыгр захварэў, і мы пераапранулі ў скуру ахоўніка.
— А чаму гарлапаніць?
— Дык другі ж тыгр у клетцы — сапраўдны.



**Маленькая Валерыя УСЕНЯ прыглядаецца да крамянёвага самародка — такі цуд прыроды з незвычайнай формай і малюнкам выкарыстоўваецца не толькі як элемент дэкору, але і як «абаронца» супраць шкоднага камп'ютарнага выпраменьвання.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# «КАМЕННАЯ КАЗКА» ЗНОЎ У МІНСКУ

**Пад такой назвай з 2 па 6 красавіка ў галоўным корпусе БДУ праходзіць 33-я мінералагічная выстаўка-кірмаш, прысвечаная Дню геолага. Прадстаўлены такія экспазіцыі, як «Бурштын краін Балтыі і Беларусі», «Дзіўная палеанталогія», а таксама аўтарскія калекцыі.**



**На выставе нават самыя пераборлівыя модніцы знойдуць цудоўныя упрыгажэнні на свой густ.**



## Мільён за ідэю

**атрымае аўтар, які прыдумае новы варыянт дызайну ўваходнага квітка ў Нацыянальны мастацкі музей.**

Штогод музей мяняе выгляд свайго квітка і штогод абраць новы варыянт яму дапамагае конкурс. Калі раней у ім удзельнічалі прафесійныя мастакі, дызайнеры, то цяпер свой праект можа прапанаваць кожны, хто толькі пажадае. Часу на роздум нямнога: прапановы прымаюцца да 29 красавіка. Імя пераможцы журы назаве 7 мая.

Менавіта гэты чалавек атрымае ад партнёраў музея самыя вялікія «прызавыя» за ўсю гісторыю конкурсу — 1 мільён рублёў. Астатніх парадуе тое, што іх творы можна будзе пабачыць на спецыяльнай выставе, дзе гледачы змогуць аддаць свае сімпатыі яшчэ адной працы. Прыз глядацкіх сімпатый прынясе аўтару 200 тысяч беларускіх рублёў і дасць неверагоднае маральнае задавальненне: маўляў, выставіўся ў галоўным музеі краіны...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


Royal

# РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## Платиновая лихорадка 2

В период **с 14 января 2008 года по 20 марта 2008 года** (включительно) в казино «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11, корп.1 проводилась рекламная игра «Платиновая лихорадка 2».

**Игра проводилась в составе комиссии рекламной игры «Платиновая лихорадка 2»:**

— Магеров Сергей Федорович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)

Члены комиссии:

— Курленя Алексей Иванович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)

— Умецкий Станислав Александрович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — заместитель начальника смены)

Призовой фонд игры в размере **57 780 000** (пятьдесят семь миллионов семьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей разыгран полностью, между следующими участниками:

В **1-ом этапе** розыгрыша, который проводился 21 января 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 1 этапа рекламной игры, получили:
- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Гесь Александр Владимирович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Гесь Александр Владимирович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

Во **2-ом этапе** розыгрыша, который проводился 24 января 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 2 этапа рекламной игры, получили:
- Борисенко Дмитрий Анатольевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Зеневич Дмитрий Викторович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Ярмолик Юрий Владимирович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **3-ем этапе** розыгрыша, который проводился 28 января 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 3 этапа рекламной игры, получили:
- Шестакович Наталья Владимировна — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Крискевич Николай Федорович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **4-ом этапе** розыгрыша, который проводился 31 января 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 4 этапа рекламной игры, получили:
- Чуйко Сергей Витальевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Наталья Владимировна — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Чуйко Сергей Витальевич — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **5-ом этапе** розыгрыша, который проводился 04 февраля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 5 этапа рекламной игры, получили:
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **6-ом этапе** розыгрыша, который проводился 07 февраля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 6 этапа рекламной игры, получили:
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **7-ом этапе** розыгрыша, который проводился 11 февраля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 7 этапа рекламной игры, получили:
- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **8-ом этапе** розыгрыша, который проводился 14 февраля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 8 этапа рекламной игры, получили:
- Чуйко Сергей Витальевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Скрыпник Федор Николаевич — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **9-ом этапе** розыгрыша, который проводился 18 февраля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 9 этапа рекламной игры, получили:
- Борисенко Дмитрий Анатольевич — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Федченко Игорь Валерьевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **10-ом этапе** розыгрыша, который проводился 21 февраля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 10 этапа рекламной игры, получили:
- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **11-ом этапе** розыгрыша, который проводился 25 февраля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 11 этапа рекламной игры, получили:
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Быков Максим Геннадьевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **12-ом этапе** розыгрыша, который проводился 28 февраля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 12 этапа рекламной игры, получили:
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **13-ом этапе** розыгрыша, который проводился 03 марта 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 13 этапа рекламной игры, получили:
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **14-ом этапе** розыгрыша, который проводился 06 марта 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 14 этапа рекламной игры, получили:
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Воропаев Александр Анатольевич — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **15-ом этапе** розыгрыша, который проводился 10 марта 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 15 этапа рекламной игры, получили:
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **16-ом этапе** розыгрыша, который проводился 13 марта 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 16 этапа рекламной игры, получили:
- Кунец Сергей Владимирович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **17-ом этапе** розыгрыша, который проводился 17 матра 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 17 этапа рекламной игры, получили:
- Крискевич Николай Федорович — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Сивко Олег Анатольевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **18-ом этапе** розыгрыша, который проводился 20 марта 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 18 этапа рекламной игры, получили:
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Федченко Игорь Валерьевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

С момента получения приза, а также любого иного дохода в рамках Игры, вышеназванные Участники несут ответственность за уплату всех применимых налогов, установленных действующим законодательством Республики Беларусь.

*Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры выдано Министерством торговли Республики Беларусь за № 968 от 04 марта 2008 года. УНП 190617507*


## СЁННЯ

**Імяніны**

**Пр.** *Васіля, Ісака.*
**К.** *Антаніны, Антона, Бенядзікта, Вацлава.*

**Месяц**

***Апошняя квадра.***
***Месяц у сузор'і Рыбаў.***

## НАДВОР'Е на заўтра




**Абазначэнні:**
- — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
- — невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
- — слабая геамагнітная бура

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +13..+15°С | КІЕЎ +11..+13°С | РЫГА +10..+12°С |
| ВІЛЬНЮС +12..+14°С | МАСКВА +12..+14°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +10..+12°С |


## Уважаемые акционеры ОАО «Технобанк»!

Настоящим уведомляем о принятии очередным (годовым) общим собранием акционеров ОАО «Технобанк», проведенным в очной форме 26 марта 2008 г. (Протокол № 1) решения о внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Технобанк», и о Вашем праве требовать выкуп акций, если это явилось следствием ограничения прав акционеров. Подача акционерами ОАО «Технобанк» заявлений с требованиями о выкупе акций осуществляется в ОАО «Технобанк» в течение 20 рабочих дней с даты проведения общего собрания акционеров (26.03.08).

Требования о выкупе акций (либо уведомление об отказе от выкупа) удовлетворяются ОАО «Технобанк» в течение 30 рабочих дней с даты подачи заявления с требованием о выкупе акций.

**Для получения дополнительной информации предлагаем обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (017) 237 43 80.**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г.*
УНП 100706562


## ИНФОРМАЦИЯ о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2007 г.

## ОАО «БЕЛКОТЛООЧИСТКА»

*(г. Минск, ул. Аранская, 22 А)*

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2008 г.

| Наименование показателя | Код строки | На начало года | На конец года (млн руб.) |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| 1. Внеоборотные активы | 190 | 423 | 335 |
| 2. Оборотные активы | 290 | 626 | 1002 |
| БАЛАНС | 300 | 1049 | 1337 |
| **ПАССИВ** | | | |
| 3. Капитал и резервы | 490 | 881 | 1044 |
| 4. Обязательства | 590 | 168 | 293 |
| БАЛАНС | | 1049 | 1337 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2007 г.

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| Выручка от реализации работ, услуг | 010 | 3299 |
| Налоги и сборы из выручки | 011 | 587 |
| Себестоимость работ, услуг | 030 | 2056 |
| Прибыль от реализации работ, услуг | 060 | 656 |
| Операционные доходы | 120 | 7 |
| Внереализационные расходы | 150 | 143 |
| Прибыль отчетного года | 200 | 520 |
| Налог на прибыль и иные обязательные платежи | 210-200 | 180 |
| Чистая прибыль | 240 | 340 |

**Директор** **М.М. Чикилев**
**Гл. бухгалтер** **С.В. Русак**

УНП 100071353



## Дзённік Вікі Ц.

***Псіхолагі даказалі: ім даруюць і дазваляюць значна больш, чым звычайным людзям. Ім з дзяцінства трэба прыкладаць мінімум намаганняў, каб прабіцца да месца пад сонцам. Яны цудоўна ведаюць, што сустракаюць па вопратцы і прызвычайваюцца прымаць самы выгадны ракурс, выклікаючы агульнае захапленне — далёка не ўсе чыталі «Партрэт Дарыяна Грэя»... Хто ж спрачаецца, прыгажосць — страшная сіла!***

**03.04.2008**

# ПРЫГОЖА ЖЫЦЬ НЕ ЗАБАРОНІШ

Спачатку гэта выклікае ўсмешку. Потым усмешка робіцца крываватай. Потым гэта напружвае і, нарэшце, выклікае раздражнёнае: ну колькі можна! Бо адна справа, калі канкрэтны чалавек (скажам, я) утаропіцца ў люстэрка і разважае: «Тут вось Танька танчэйшая за мяне, але затое ў мяне рукі больш зграбныя». І зусім іншая — калі кожны год цэлая краіна, разбіўшыся на падгрупы — прадпрыемствы, галіны вытворчасці, установы адукацыі — высвятляе паміж сабой, «хто ў свеце за ўсіх наймілейшы» і далей па тэксце.

Гэта толькі на першы погляд здаецца, што баль правіць выключна нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь». Калі прыгледзецца, у вачах рабаціннне ад усялякіх «місак»: ад Міс Сусвету (дзякуй, што не Космасу) да Міс Мікрараён, ад Міс Хлебпрам і да Каралевы Вясны (хоць нейкая разнастайнасць). І зноў — міс, міс, міс... Дзіўная, незразумелая і нават крыху нездаровая тэндэнцыя.

Па-першае, «міс» у нашых шыротах гучыць дзіка. Чаму тады не фрэкен, сіньярына ці мадэмуазэль? Зрэшты, хоць ты паннай назаві, сама ідэя — чужая, завезеная з далёкіх краёў, як некалі бульба, і перасаджаная ў прыдатную глебу. Прычым прыдатнай гэта глеба стала адносна нядаўна: першы конкурс прыгажосці ў СССР прайшоў у 1988 годзе. Што датычыцца ранейшых часоў — не сустракала я нешта ў падручніках гісторыі спасылак, як нашы продкі карагодам выбіралі «Міс Вільня-1323», наладзіўшы дэфіле з каромыслам. Зусім іншае цанілася ў жанчынах. Тады. А цяпер?

Дарэчы, вы ніколі не задумваліся, чаму конкурсы прыгажосці не праходзяць, скажам, сярод коней ці сабак? Чаму не параўноўваюць першэрона са звычайнай вясковай «дахадзягай», а далмацінца — з балонкай? Правільна, бо для жывёл такое мерапрыемства завецца вы-ста-вай, і ацэньваецца на ёй кожная парода паасобку, па сваіх крытэрыях. Але ж «чалавечая выстава» гучыць неяк абразліва, як кунсткамера, дзе сабраныя вычварэнні. Таму мы бяром на сябе смеласць назваць гэта конкурсам. І нічога, што спаборнічае ў ім адна і тая ж «парода», часта адрозніваючыся паміж сабой толькі «поўсцю» ды «масцю».

Гэта і ёсць тая другая акалічнасць, якая робіць конкурсы прыгажосці здзекам з чалавечай прыроды — міфічныя эталоны, выпрацаваныя невядома кім і калі. Зразумела, што мадэльерам зручней шыць па ўніфікаваных лякалах. Але прычым тут прыгажосць да гэтых пракруставых мерак? Мастакі сярэднявечча таксама карысталіся правілам «залатога сячэння», аднак вельмі часта прызнанымі прыгажунямі рабіліся жанчыны, якія зусім не адпавядалі ідэальнай матэматычнай гармоніі...

Але сёння — іншая справа, «негарманічныя» шанцаў не маюць. Рост ад 175, параметры 90-60-90, вага 55 — хто менш?

Самае жахлівае, што гэтыя стандарты — двайныя. Мы робім выгляд, што цудоўна разумеем розніцу паміж прафесіяй «мадэль/дэманстратар адзення» і проста прыгожай дзяўчынай. Але карона дастанецца ўсё ж той, на кім «касцюмчык сядзіць». Мы каронуем чарговую танклявую, даўганогую, празрыстую дзяўчыну са славутымі параметрамі. А потым, калі падлеткі, прымяраючы і пераймаючы гэты вобраз на сябе, хварэюць на анарэксію, комплексуюць з-за «лішніх» сантыметраў і кілаграмаў — шчыра суцяшаем: кінь дурное, галоўнае ў чалавеку — прыгожая душа і багаты ўнутраны свет! Так, у чалавеку — быць можа. Але да жанчыны дадатковыя патрабаванні. ...Не паленаваўшыся, прагледзела я сёлета некалькі адбораў на «Міс Беларусь». З пары дзесяткаў прыгажунь толькі адна (!) узгадала ў рэзюме, што дапамагае інвалідам і пажылым людзям. І што? Далей паўфіналу дзяўчына не прайшла.

Нядаўна дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці Вольга Сярожнікава паспрабавала сябе ў ролі публіцыста — напісала, як несправядліва многія ставяцца да ўдзельніц конкурсаў прыгажосці. Маўляў, што вы хочаце, дзяўчаты ўпершыню перад камерамі, натуральна, губляюцца. І ўвогуле, зайздрасць — дрэннае пачуццё, так што не трэба пляваць атручанай слінай і зрываць свае комплексы... Я разумею жаданне абараніць прэстыж і годнасць конкурсаў. Але — з іншага боку, у чым праблема? Дзяўчат на такія мерапрыемствы ніхто гвалтам не цягне, яны прыходзяць самі — па славу, па кантракты, па прызы, па магчымасць пабачыць свет, можа, па багатага мужа, не ведаю. Але ў любым выпадку яны лічаць, што знешняя прыгажосць дае ім права на пералічаныя выгоды! А гэта права яшчэ заслужыць трэба, як паўсюль — праз агонь, ваду і медныя трубы. Так што ўсё справядліва. Гімнасткі-«мастачкі» вунь, як адна, прыгожыя, але пры гэтым яны яшчэ майстры спорту. А проста прыгожы чалавек — гэта не прафесія, і найперш нешта павінна быць за душой.

Не, я не супраць — няхай яны будуць, і Міс Сусвету, і Міс Сталёвых (і не толькі) магістраляў. Але няхай гэта будуць не спаборніцтвы чалавечага цела, а вялікія святы прыгажосці. Увогуле, памятаеце, што класік сказаў: «Свет прыгажосцю выратуецца»? Меў рацыю Фёдар Міхайлавіч — менавіта прыгажосцю, той, якой не будзе патрэбы даказваць, што яна самая прыгожая. Прыгажосцю. А не яе культам.

## Дзве даты — 4 красавіка

**1784 год** — нарадзіўся Зарыян Якаўлевіч Даленга-Хадакоўскі, славяназнаўца, пачынальнік беларускай, рускай, польскай і ўкраінскай археалогіі, этнаграфіі і дыялекталогіі. У 1818 годзе ўпершыню ў Беларусі атрымаў ад Віленскага ўніверсітэта ліст на права археалагічных раскопак і пачаў даследаваць гарадзішчы ў Полацку, Віцебску, Тураве, Гомелі і іншых гарадах, адначасова рабіў запісы фальклору, мясцовых дыялектаў і абрадаў. Вынікам гэтых даследаванняў стала ягоная навуковая праца «Пра славяншчыну да хрысціянства».




**1896 год** — на радзіме антычных Алімпіяд, у Грэцыі, адбыліся першыя Алімпійскія гульні сучаснасці. Больш як 60 тысяч гледачоў назіралі за выступленнямі 311 спартсменаў з 13 краін свету. У праграму Гульняў увайшлі 9 відаў спорту — бег, кіданне дыска, барацьба і іншыя. Як і ў даўнім мінулым, у спаборніцтвах удзельнічалі толькі мужчыны.

## Цытата дня:

***«Нас ацэньваюць або празмерна высока, або наогул недаацэньваюць; нас ніколі не прымаюць па нашай рэальнай вартасці».***

**Марыя Эбнер-Эшэнбах (1830—1916), аўстрыйская пісьменніца.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.**

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

**html:** www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.840 Індэкс 63850. Зак. № 1813. Нумар падпісаны ў 19.30.**

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12